16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 37 (5298) 27 верасня 2024 г. ISSN 0024-4686

Ці маюць людзі крылы? стар. 6

Непарушная еднасць класікаў стар. 10

Вучыць любові да бліжняга стар. 13

Помнім мы — каб помнілі нашчадкі

Фота Лізаветы Голад.

Сцэна са спектакля.

Бягучы год праходзіць пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтая знамянальная дата шырока адзначаецца па ўсёй краіне на самых розных узроўнях. Вялікую ўвагу ёй удзяляюць і тэатральныя дзеячы. У прыватнасці, Вялікі тэатр Беларусі падрыхтаваў унікальны творчы праект «Патэтычны дзённік памяці», які быў рэалізаваны пры садзейнічанні Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Стваральнікам канцэпцыі, лібрэта і пастаноўшчыкам названага праекта з'яўляецца галоўны рэжысёр тэатра Ганна Маторная. Аўтар музычнай рэдакцыі — кампазітар Алег Хадоска, які на аснове сачыненняў беларускіх кампазітараў-класікаў стварыў адзіную партытуру, у якую ўвайшлі і яго ўласныя творы. Над пастаноўкай працавалі галоўны дырыжор Арцём Макараў, галоўны балетмайстар Ігар Колб, галоўны хормайстар Ніна Ламановіч, галоўны мастак Любоў Сідзельнікава. І задзейнічаны ў ёй усе калектывы тэатра: аркестр, хор, салісты оперы і балета, міманс, а таксама юныя артысты Дзіцячага музычнага тэатра-студыі і Балетнай школы Вежнавец.

Працяг на стар. 12 ▸

«ЛіМ»-акцэнты

Вернісаж. Урачыстае адкрыццё выставачнага праекта «Кнігі ў дар Прэзідэнту» адбылося ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі. Упершыню на адной пляцоўцы шырокай публіцы дэманструецца калекцыя кніг, падораных Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку кіраўнікамі дзяржаў блізкага і далёкага замежжа, дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі розных краін. Урачыста адкрылі выстаўку першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка і генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 50 выданняў са збору Палаца Незалежнасці, Прэзідэнцкай бібліятэкі і НББ — рэдкія кнігі XVIII—XIX стагоддзяў, а таксама сучасныя выданні рознай тэматыкі. Бібліяграфічную каштоўнасць і ўнікальнасць ім надаюць пакінутыя аўтографы і дароўныя надпісы, арыгінальныя пераплёты і г. д. Выстаўка будзе працаваць да 12 студзеня 2025 года.

Форум. І Форум блогераў Беларусі «БлогБай. Нам ёсць што сказаць!» збірае больш за 150 прадстаўнікоў блогерскай супольнасці з усёй краіны, гаворыцца на сайце Міністэрства інфармацыі. Мерапрыемства ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку пачнецца сёння і завершыцца заўтра. У праграме — тэарэтычныя і практычныя заняткі, наведванне знакавых месцаў і пляцовак сталіцы, нефармальныя зносіны з экспертамі медыйнай супольнасці, журналістамі і кіраўнікамі СМІ, прэзентацыя дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі Беларусі. Арганізатар І Форуму блогераў — Міністэрства інфармацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і РУП «Белтэлекам».

Праект. 2 кастрычніка ў Нацыянальным гістарычным музеі адбудзецца адкрыццё выстаўкі аднаго прадмета, прысвечанай 100-годдзю заснавання першай беларускай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Мерапрыемства запланавана ў рамках праекта «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры». Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР быў заснаваны 1 верасня 1924 года пастановай ЦВК і СНК БССР. Распрацоўкай праекта ўзнагароды займаўся мастак Генадзь Змудзінскі. Усяго было выраблена 300 ордэнаў, узнагароджанняў жа, паводле няпоўных звестак, было 169. Пасля заснавання агульнасаюзнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ўручэнне ордэнаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі было спынена ў 1933 годзе. На выстаўцы будзе прадстаўлены ордэн № 159, якім узнагародзілі Лазара Грынвальд-Муху ў 1932 годзе за працу ў органах АДПУ.

- Выстаўка абраза «Нараджэнне Маці Божай» 1648—1650 гг. адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі. Яна прымеркавана да свята Нараджэння Прасвятой Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі. Кампазіцыя «Нараджэнне Маці Божай» становіцца класічнай у помніках візантыйскага жывапісу X—XIII стст., нагадваюць у музеі. Прадстаўлены абраз дэманструе традыцыйны варыянт іканаграфіі. «У правай частцы кампазіцыі паказана Праведная Ганна ў чырвоным адзенні, якая сядзіць на ложы. Перад ёй стол з дарамі і пачастункамі, прынесенымі служанкамі. Злева, у аконным праёме вежы, — праведны Іаакім. У ніжняй частцы кампазіцыі змешчаны сцэны "Купання немаўля Марыі", "Спавівання немаўля Марыі" і "Ласкання бацькамі немаўля Марыі"», — расказваюць арганізатары. Выстаўка будзе працаваць да 6 кастрычніка. Куратар — Любоў Сысоева, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва НММ.

Адукацыя. Цыкл тэматычных кіналекторыяў па беларускіх дакументальных фільмах прадстаўляюць у Музеі гісторыі беларускага кіно — філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея. Удзельнікаў чакаюць майстар-класы ад вопытных рэжысёраў, гутаркі з прадстаўнікамі здымачных груп, дыскусіі ды іншае. Першы тэматычны кіналекторый «Увага, трэці званок...» прайшоў учора. На ім гледачы ўбачылі фільмы «Святлана Данілюк», «Прастора Яўгена Лысіка», «Ларыса Александроўская».

- Цэнтр беларускай драматургіі запрашае на лекцыю тэатразнаўцы Яўгеніі Бачылы «Беларускія рэжысёры: Барыс Луцэнка», якая пройдзе 2 кастрычніка. Барыс Луцэнка — рэжысёр, народны артыст Беларусі. «Распрацоўваючы тэму дабра і зла, ён імкнуўся стварыць той тэатр, які дапаможа чалавеку зразумець самога сябе — спавядальны тэатр. Цяпер шматлікія адкрыцці рэжысёра і пастановачныя прыёмы могуць здавацца звыклымі, але за імкненне да метафарычнага, а не бытавога тэатра Барыс Луцэнка доўгі час падвяргаўся крытыцы. На лекцыі вы даведаецеся, як ён працаваў з п'есай тэксту і як гэта паўплывала на развіццё беларускага тэатра», — расказваюць у Цэнтры беларускай драматургіі.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Медалі Багдановіча — кітайскім перакладчыкам

Прафесара Нанькайскага ўніверсітэта Гу Юя і прафесара Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Хань Сяае добра ведаюць у творчым асяроддзі беларускіх майстроў прыгожага пісьменства. Дзякуючы намаганням Хань Сяае ў Пекіне выдадзена калектыўная кніга твораў беларускіх паэтаў і празаікаў, прафесар таксама пераклаў на кітайскую мову «Тры талеры» Андрэя Федарэнкі, зборнік прозы і паэзіі Алеся Бадака.

— Цяпер працую над перакладам калектыўнага зборніка прозы «Іголка ў квадраце», куды ўвайшлі апавяданні пісьменнікаў Беларусі, якія пішуць на рускай мове, — расказаў Хань Сяае. — Асаблівую асалоду атрымаў ад знаёмства з прозай Алега Ждана, Алены Паповай, Сяргея Трахімёнка, іншых аўтараў кнігі, якая пабачыла свет у праекце Саюза пісьменнікаў Беларусі і выдавецтва «Аверсэв» — «Сучасная беларуская літаратура». Ведаю, што ўсяго ў серыі выйшла ўжо дзесяць тамоў. Некаторыя з іх ёсць у бібліятэцы Цэнтра даследаванняў Беларусі Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў.

Што да перакладчыка Гу Юя, то ім неверагодна шмат зроблена па прадстаўленні беларускай паэзіі на кітайскай мове. Найперш — паэзіі класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Максіма Багдановіча.

Мікола БЕРЛЕЖ

Аб духоўнай велічы

Літаратурны конкурс «Духоўная веліч» быў заснаваны ў 2018 годзе Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама сумесна з Брэсцкай і Пінскай епархіямі і Беларускім фондам міру.

На конкурс прымаюцца творы ў намінацыях «Паэзія», «Мастацкая проза», «Публіцыстыка», «Літаратура для дзяцей». У творчым спаборніцтве ўдзельнічаюць аўтары, якія пражываюць на Брэстчыне і дасягнулі 18 гадоў. Адборачная камісія прымае літаратурныя творы любых жанравых і кампазіцыйных асаблівасцей (раман, аповесць, п'еса, зборнік апавяданняў, эсэ, вершаў, казак або мастацкай публіцыстыкі) на рускай і беларускай мовах.

Творы могуць быць прадстаўлены асобнымі кнігамі альбо публікацыямі ў рэспубліканскіх і замежных літаратурных перыядычных выданнях, якія пабачылі свет на працягу пяці гадоў да часу абвяшчэння творчага спаборніцтва.

Конкурсныя работы (два асобнікі выдання і заяўка з асабістымі звесткамі) прымаюцца да 1 кастрычніка 2024 года. Работы неабходна дасылаць на адрас: 224013, г. Брэст, праспект Машэрава, 75/1, каб. 605. Дасланыя творы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ

фестывалі

Сустрэчы ў Завоссі

Штогод на радзіме Адама Міцкевіча ладзіцца літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі». Гэты год не стаў выключэннем. 21 верасня ў Музей-сядзібу Міцкевічаў «Завоссе» зноў з'ехаліся госці з Баранавіцкай зямлі і суседніх раёнаў, а таксама жыхары Мінска, Брэста, Гродна і іншых гарадоў.

Надзвычай цікавай, насычанай і разнастайнай атрымалася сёлетняя праграма фестывалю. Арганізатары — Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Баранавіцкі райвыканкам — запрасілі да ўдзелу таленавітых людзей і калектываў, стварылі для наведвальнікаў дзясяткі пунктаў самых розных актыўнасцей.

Урачыстае адкрыццё адбылося з удзелам намесніка старшыні Баранавіцкага райвыканкама Міхаіла Барысевіча, дырэктара Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргея Усіка, а таксама замежнага госця — дырэктара Дзяржаўнага музея-запаведніка «Астаф'ева» — «Рускі Парнас» (г. Масква) Юрыя Яўцюхіна.

Пасля падвядзення вынікаў конкурсу «Там пакінуў я душы часцінку…» на сцэне разгарнулася літаратурна-музычная праграма. Гучала шмат прыгожых і мілагучных песень пра Беларусь у выкананні творчых калектываў Баранавіцкага раёна, чыталі свае вершы вядомыя і пачынаючыя паэты. Маладая публіка горача вітала на сцэне беларускага музыканта і блогера Ілью Шынкарэнку. Яркім гучаннем народных і аўтарскіх песень уразіў гледачоў народны фальклорны ансамбль «Сарматы».

Наведвальнікі атрымлівалі асалоду ад непаўторнай музычна-спеўнай спадчыны Міцкевічавай пары. Шмат гледачоў сабрала музычная праграма «Легенда Пана Тадэвуша» ў выкананні Святлены Немагай, Галіны Сакольнік і Таісіі Халамавай. Многіх прывабілі спевы Аляксея Жбанава і медытатыўнае гучанне музычных інструментаў капэлі Алеся Лася. У выкананні спявачак Студэнцкага этнаграфічнага таварыства прагучала праграма «Хадзіў раёк».

У сядзібным доме можна было паўдзельнічаць у цікавых гутарках, прысвечаных Адаму Міцкевічу.

Сярод аматараў відовішчаў была папулярная пляцоўка гістарычнай анімацыі. Дарослыя і малыя з захапленнем назіралі за шабельнымі баямі «феадалаў», самі вучыліся валодаць мячом, знаёміліся са шляхецкімі гульнямі і слухалі расповеды пра штодзённае жыццё нашых продкаў.

На «Бібліятэчным падворку», арганізаваным Баранавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Яна Чачота, часталі духмянай гарбатай і забаўлялі гульнямі, квестамі, інтэрактывамі. На імправізаванай сцэне выступалі паэтычныя клубы і літаб'яднанні Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Пінскага, Лунінецкага, Ганцавіцкага раёнаў, спявалі народныя вакальныя ансамблі.

Падчас свята праводзіліся экскурсіі, квесты і квізы па асноўнай экспазіцыі музея. Сваю пляцоўку з фотазонай і майстар-класамі прэзентаваў Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Адной з цікавостак свята стала літаратурна-дакументальная выстаўка «Пушкін, Вяземскі і Міцкевіч на "Рускім Парнасе"», прадстаўленая Дзяржаўным музеем-запаведнікам «Астаф'ева» — «Рускі Парнас».

На творчых майстар-класах можна было павучыцца старадаўнім танцам, зрабіць памятную манету, казачную птушку, сувенірны магніт або веер.

Алена СЯМАШКА, фота аўтара

між іншым

Ляцелі песні над пушчай

Турыстычнае свята «Роў аленяў» і фестываль бардаўскай песні і паэзіі «Музыка восені» трэці раз прайшлі ў Белавежскай пушчы.

Выканаўцы песень пад гітару з Мінска, Брэста, Камянца і аграгарадка Дзмітравічы Камянецкага раёна спявалі ўсім вядомыя аўтарскія песні. Некаторыя барды дзяліліся з прысутнымі сваёй паэтычнай творчасцю. Лірычныя вершы чыталі таксама члены літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які дзейнічае ў Кобрыне пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кіраўнік клуба Наталля Ніжнік (Кандрашук) адкрыла фестываль сваім вершам «Залістападзілася…».

Уразіла выступленне самага юнага ўдзельніка фестывалю Міхаіла Карайчанцава з Мінска. Літаральна з першых гітарных акордаў і песенных радкоў 15-гадовы бард зачараваў усіх прысутных. Прыгожы голас Алесі Салаўёвай таксама не пакінуў слухачоў абыякавымі. Брастаўчанін Аляксей Дзямчук прыцягнуў увагу слухачоў песняй пра Брэсцкую крэпасць.

Ніна ПЯТРОЎСКАЯ

конкурсы

З любоўю да кнігі

На свяце «Сузор'е найлепшых чытачоў», што адбылося ў гарадской дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 13 Брэста, узнагароджаны пераможцы конкурсу кніжных закладак «З любоўю да чытання».

Штогадовы конкурс арганізаваны Брэсцкім абласным аддзяленнем СПБ сумесна з Брэсцкай гарадской бібліятэкай імя А. С. Пушкіна. Сёлета творчае спаборніцтва было прымеркавана да Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах, Года якасці і 85-годдзя ўтварэння Брэсцкай вобласці.

Кожны год да конкурсу далучаюцца новыя ўдзельнікі, з цікавымі ідэямі і прапановамі ўключаюцца ў працу родныя, сябры, настаўнікі маленькіх чытачоў. Кніжныя закладкі здзіўляюць арыгінальнасцю формаў, тэхнікай выканання. Ва ўсіх работах прасочваюцца нацыянальныя матывы, творы поўняцца яркімі ўражаннямі ад прачытанага і шчырай любоўю да кнігі і малой радзімы.

Сёлета ўладальнікам першага дыплома стаў Міхась Саўчук з кніжнай закладкай «Валошкі», другое месца атрымала Ксенія Чырэц з работай «Прысвячэнне Брэсту», трэцяе заняў Аляксандр Мельнічук з кніжнай закладкай «Дарагі сэрцу куточак».

Загадчыца філіяла і вядучая мерапрыемства Святлана Івашкова таксама ўручыла дыпломы і прызы пераможцам міжнароднага літаратурнага анлайн-марафону

Пераможцы конкурсу.

«Мой Пушкин.*com*: "Я памятник себе воздвиг нерукотворный…"», а намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Брэсцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Алёна Голік адзначыла найлепшых у конкурсе чытацкіх дзённікаў па матывах прачытаных кніг беларускіх аўтараў «Лета і кніга».

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ
Фота даслана аўтарам

праекты

Суперсябра К наведаўся да палеграфістаў

Валянціну Драбышэўскую, паэтэсу, празаіка, дзіцячую пісьменніцу, перакладчыцу, аўтара Выдавецкага дома «Звязда», добра ведаюць у многіх школах і бібліятэках Мінска, ды і ўвогуле нашай краіны. Са сваім творчым праектам «У пошуках суперсябра К», галоўнай мэтай якога з'яўляецца прапаганда дзіцячай кнігі, дзіцячага чытання, пісьменніца пабывала ў многіх куточках Беларусі.

А днямі Валянціна Драбышэўская правяла квэст-гульню для маленькіх жыхароў інтэрната Паліграфкамбіната імя Якуба Коласа. Дзеці з радасцю, весела ўдзельнічалі ў сапраўдным свяце — адгадвалі загадкі, спявалі песні, чыталі вершы, на некаторы час станавіліся акцёрамі ў тэатрах-экспромтах, наладжаных Валянцінай Драбышэўскай. А яшчэ юныя ўдзельнікі сустрэчы знайшлі чароўны ключ і зрабілі сапраўднае адкрыццё: «Суперсябра К — гэта кніга!»

Усе этапы гульні патрабавалі ўвагі, актыўнага ўдзелу літаральна кожнага з хлопчыкаў і дзяўчынак. Не засталіся ўбаку нават бацькі юных удзельнікаў сустрэчы з пісьменніцай. Пераможцы квэст-гульні атрымалі дыпломы ад Выдавецкага дома «Звязда», а галоўным падарункам для дзяцей сталі новыя кнігі Валянціны Драбышэўскай: «Секретно! Для мальчишек!», «Секретно! Для девчонок!», «Тринадцать первоплощений».

Дарэчы, у «Звяздзе» падрыхтавана да друку новая кніга Валянціны Драбышэўскай. Гэтым разам пісьменніца раскрывае болей складаную тэму — лёс дзіцяці ў Вялікую Айчынную вайну.

Мікола БЕРЛЕЖ

ініцыятывы

Бібліятэкі пад адкрытым небам

Адразу некалькі бібліятэк адкрылася ў Рагачове. Усе яны знаходзяцца пад адкрытым небам. Крэатыўны праект «Чытаем разам» ажыццявілі прадстаўнікі КЖЭУП «Рагачоў», раённага аддзялення партыі «Белая Русь», лясгаса і цэнтральнай раённай бібліятэкі імя У. Караткевіча. Па ініцыятыве намесніка дырэктара камунальнага жыллёвага прадпрыемства Алесі Бяссонавай іх намаганнямі створаны міні-бібліятэкі, дзе кожны зможа адпачыць за чытаннем кнігі, якая яму спадабалася.

Альтанкі з лаўкамі ўстанавілі ў Парку піянераў на набярэжнай Дняпра невыпадкова, бо менавіта гэтая рака натхняла Уладзіміра Караткевіча на напісанне выдатных твораў. А цяпер і рагачоўцы з кнігамі ў руках будуць тут чэрпаць натхненне і душэўную энергію, адзначаюць стваральнікі. Невыпадкова бібліятэкі адкрылі ў Дзень народнага адзінства, бо мэта праекта — аб'ядноўваць жыхароў і гасцей горада з дапамогай чытання, прывіваць любоў да кнігі.

Між іншым, падчас адкрыцця міні-бібліятэк на сумежнай тэрыторыі арганізатары праекта «Чытаем разам» пасадзілі рабінавую алею — семдзесят дрэўцаў.

Міхась СЛІВА

Аб прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2025 года ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці

З 1989 года, раз на два гады, да Свята працы — 1 Мая прысуджаюцца прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці. За гэты час уручана 148 прэмій, лаўрэатамі сталі 4 прафесійныя і 26 аматарскіх калектываў мастацкай творчасці, 203 дзеячы культуры, мастацтва, журналісты. 30 жніўня 2024 г. прынята рашэнне аб умовах прысуджэння прэмій 2025 года. Іх будзе:

а) пяць прэмій у галіне літаратуры і мастацтва, у тым ліку:

за творы прозы, паэзіі і драматургіі — адна прэмія;

за музычныя творы, канцэртна-выканальніцкую дзейнасць — адна прэмія;

за работы ў галіне тэатральнага мастацтва і кінамастацтва — адна прэмія;

за творы жывапісу, скульптуры, графікі прыкладнога мастацтва — адна прэмія;

за найлепшы твор аб прафсаюзах (літаратурны, музычны, канцэртны, тэатральны, кінамастацкі, жывапісны, скульптурны і іншы) — адна прэмія;

б) адна прэмія за актыўную работу па развіцці народнага мастацтва і аматарскай творчасці працоўных (сярод кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый, прафсаюзных і ведамасных устаноў культуры, старшынь прафсаюзных арганізацый);

в) адна прэмія за выдатныя дасягненні аматарскіх калектываў мастацкай творчасці;

г) адна прэмія ў галіне журналістыкі.

На саісканне прэміі ФПБ прымаюцца творы і работы, якія апублікаваны, публічна паказаны ці выкананы за апошнія 4 гады, але не пазней чым за 6 месяцаў да ўстаноўленага тэрміну вылучэння на саісканне прэміі. Не могуць быць прадстаўлены творы і работы, якія адначасова вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, міжнародных прэмій ці прэмій іншых дзяржаў або якія ўжо атрымалі такія прэміі.

Колькасць саіскальнікаў на атрыманне прэміі ФПБ у складзе калектыву аўтараў не павінна перавышаць чатыры чалавекі.

Вылучэнне работ і твораў на саісканне прэмій ФПБ праводзіцца на сходах працоўных калектываў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, пасяджэннях прэзідыумаў раённых, абласных і рэспубліканскіх камітэтаў і аб'яднанняў прафсаюзаў, калегій прэзідыумаў праўленняў органаў культуры, творчых саюзаў, міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым улічваецца абавязковае членства ў прафсаюзе кандыдата і яго ўдзел у рабоце прафсаюзнай арганізацыі, выбарных органаў прафсаюзаў мерапрыемстваў, якія праводзяцца прафсаюзамі, і інш.

Памер прэмій Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2025 года будзе ўстаноўлены пры прыняцці рашэння аб іх прысуджэнні ў красавіку 2025 г.

Дакументы і матэрыялы для вылучэння работ і твораў на саісканне прэмій Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі прымаюцца да 1 снежня 2024 г. Камісіяй па прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (220126, г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 21, пакой 605).

Тэлефон для даведак: 8 (017) 3759630.

«ЛіМ»-люстэрка

Ўдні Санкт-Пецярбургскага міжнароднага форуму аб'яднаных культур у Мармуровым палацы Рускага музея адкрылася выстаўка «Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў». Як гаворыцца на сайце *artmuseum.by*, для экспазіцыі расійскі музей і Нацыянальны мастацкі музей Беларусі адабралі каля 300 жывапісных палотнаў, твораў графікі і скульптуры майстроў, якія нарадзіліся на беларускіх землях і атрымалі прафесійную адукацыю ў расійскіх навучальных установах. Так, праект знаёміць гледача з творчай спадчынай больш як 50 выдатных аўтараў. У парадных залах Мармуровага палаца выстаўка будзе даступна да 2 снежня, а затым адправіцца ў Мінск.

Мастацкі кіраўнік і дырэктар Дзяржаўнага акадэмічнага Марыінскага тэатра, генеральны дырэктар Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі Валерый Гергіеў выступіць у Мінску 8 снежня з канцэртам, прымеркаваным да 25-годдзя Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі. Пра гэта паведамляе «ИТАР-ТАСС» і ўдакладняе, што напярэдадні канцэрта з удзелам аднаго з праслаўленых калектываў, якім кіруе Валерый Гергіеў, павінны адбыцца гастролі Вялікага тэатра Беларусі ў Маскве. Запланаваны таксама экспертна-медыйны форум, канферэнцыя, дзе акрамя ўзаемадзеяння дзвюх краін будуць закрануты і іншыя тэмы.

Дні культуры Беларусі праходзяць у Новасібірску, перадае БелТА. Дэлегацыю ўзначальвае першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада. У праграме — гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі, Дні беларускага кіно, выставачны праект Нацыянальнага гістарычнага музея «Беларусь у рытме традыцый», кірмаш беларускіх тавараў. У яго адкрыцці прымае ўдзел заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь фальклорны гурт «Купалінка». Кірмаш прадоўжыць работу да 6 кастрычніка.

Завяршыўся III Мінскі міжнародны фестываль цыркавога мастацтва. Гран-пры заваяваў паветраны гімнаст на трапецыі Жаао Гадзіньё з Партугаліі. Адно «золата» ўзялі беларускія эквілібрысты на канаце пад кіраўніцтвам Алега Лабанава. Яшчэ дзве ўзнагароды — у скарбонцы Расіі: журы пакарылі «Тыгры-шоу» ад Карыны і Артура Багдасаравых з Маскоўскага цырка Нікуліна і «Кола смеласці» ў выкананні Андрэя Пагарэлава. Адна з дзвюх сярэбраных узнагарод фестывалю дасталася выхаванцам дрэсіроўшчыка Казанскага дзяржаўнага цырка Алега Хоціма. Другое «серабро» атрымалі паветраныя гімнасты Крысціян Трывіньё і Лаура Льярэда з Калумбіі. Беларускія паветраныя гімнасты Наталля Нарышкіна і Глеб Казленка ўзялі «бронзу».

Правядзенне VIII Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія. *DOC*» запланавана ў Мінску 3 і 4 кастрычніка. У кароткай праграме будуць прадстаўлены 32 фільмы-фіналісты з Беларусі, Расіі, краін СНД і далёкага замежжа. Да таго ж пройдуць адкрытыя паказы ў кінатэатры «Беларусь», сустрэчы з аўтарамі, круглыя сталы ды іншыя мерапрыемствы. Фестываль з'яўляецца некамерцыйным і праходзіць пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. Арганізатарам з беларускага боку выступіў Беларускі саюз журналістаў.

Выстаўка «Наш Афон» фотамастака Костаса Асіміса адкрылася ў Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П. В. Масленікава. Як інфармуе БелТА, экспазіцыя стала вынікам змацаванага мемарандумам супрацоўніцтва магілёўскага музея і Бранскага абласнога мастацкага музейна-выставачнага цэнтра. Амаль 300 здымкаў расказваюць пра святую гару Афон, якая ўжо амаль 40 гадоў застаецца галоўнай тэмай жыцця і творчасці Костаса Асіміса. «У свой час дзякуючы фатографу быў выратаваны і адрэстаўрыраваны ўнікальны старадаўні фотаархіў рускага Панцеляймонавага манастыра, у якім захоўваюцца рэдкія фота часоў нямецкай акупацыі, зробленыя ў той час іераманахам Васіліем», — расказалі ў музеі. Выстаўка «Наш Афон» прадоўжыцца да 18 кастрычніка.

Міжнародны фестываль лялечнага мастацтва «Лялькі над Нёманам» прайшоў у Гродне. Фэст аб'яднаў каля 150 удзельнікаў з розных куткоў Беларусі — Брэста, Мінска, Магілёва і Гродна, калектывы тэатраў лялек з расійскіх Разані, Мурманска, Санкт-Пецярбурга, Казані, Арэнбурга, Волагды, Сахаліна. Як перадае БелТА, упершыню на мерапрыемства прыехалі акцёры з Казахстана і Узбекістана. На працягу пяці дзён праходзілі спектаклі як для дарослых, так і для дзяцей. Сярод найбольш чаканых пастановак быў «Авіятар» ад Татарскага тэатра лялек «Экіят» з Казані (ён уладальнік Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска») і старажытнагрэчаская трагедыя «Антыгона. Міф» Санкт-Пецярбургскага малога тэатра лялек. Закрыў фестываль спектакль Гродзенскага тэатра лялек «яЖпрынцэса».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Пародыі

Анатоль ЗЭКАЎ

Любоў без слоў

Каб расказаць, як я жыла,
Мне хопіць верша.
.....
Каб выказаць сваю любоў,
Зашмат мне сказа.

Алёна Папко

За век нідзе я не была,
Тым болей, у замежжы.
Каб распавесці, як жыла,
Мне хопіць нават верша.

Ды і таго страфы на тры —
І ні страфою болей.
Шматслоўе мне не па нутры, —
А слова-два — й даволі.

Цябе сустрэну моўчкі, бо
Маўчаць з табой хачу я…
Хай выкажу без слоў любоў —
Ды ты яе адчуеш.

Як выдаць кніжку

У душы нараджаліся вершы.
Верыў сам, што пішу недарма.
Шмат разоў быў на конкурсах першы.
Толку з гэтага, праўда, няма.

Марыў: выдадуць некалі кніжку.
Жыў надзеяй на розных асоб.
.....
Я, канешне, не Янка Купала,
Але ўсё ж беларускі паэт.

Уладзімір Цанунін

У душы нараджаліся вершы,
І душа вершавала так спеўна.
Я пісаў і сябе думкай цешыў,
Што выводжу радкі недарэмна.

Нагадаць чытачам, пэўна, варта,
І, бадай, гэта будзе не лішнім:
Я на конкурсах быў лаўрэатам
І не горшы з усіх тых, хто піша.

Марыў: выдадуць кніжку, магчыма,
Абяцалі ж — і я ў гэта верыў,
Ды знаходзілі ўсюды прычыны,
Каб не здзейсніць падобных намераў.

Я, канешне ж, не Янка Купала
І між класікаў, зрэшты, не класік,
Хоць паэт беларускі й нямала
За жыццё вершаў я назапасіў.

Што мне выдаць іх хто дапаможа,
Спадзявацца, напэўна, залішне.
Зноў пакрыху збіраць трэба грошы,
Каб самому на іх выдаць кніжку.

Казачная локшына

Марныя словы. Марныя словы.
Так, мне адчайна хацелася ласкі.
Вось і плялі вы сілок адмысловы.
Толькі ж я чула і лепшыя казкі.

Настасся Нарэйка

Бы ў казачным свеце,
Жылі мы абое,
Калі ж па сакрэце:
Ўсё гэта не тое.

Я слухала казкі,
Якія складаў ты
І мне замест ласкі
Расказваў упарта.

Як локшыну, казкі
На вушы ўсё вешаў.
Не казачнай ласкі
Хацела найперш я.

Сілок адмысловы
Ты марна плёў з казак.
Я ж марныя словы
Ўлавіла адразу.

А ты ўсё расказваў —
Спыніць немагчыма.
Ды чула шмат казак
Ад іншых мужчын я.

Навошта ж мне казкі,
Якія не грэюць?
Мо лепей расказваць
Іх буду табе я?

Пераборлівая патрыётка

Перабіраю ў думках гарады,
куды б аднойчы з'ехаць захацела...
.....
Венецыя? — Але ж там шмат вады.
Парыж? — Была, ды ён занадта шэры.
Рым? — Вельмі вечны, мне чаго туды?
І ў Вене недахопаў бачу шэраг.
.....
Мне іншыя навошта гарады,
калі на карце свету ёсць мой Гродна.

Людміла Кебіч

Гляджу на карту й гарады
На ёй у думках выбіраю.
Куды б паехаць мне, куды?
Ну хоць бы хто з сяброў параіў!

Не райце мне Венецыю ў вадзе,
Парыж з Эйфелеваю вежай.
І што на вечны Рым глядзець,
Які мяне зусім не цешыць?

Не трэба мне Стамбул і Осла,
Афіны, Прага, Вена, Лондан...
Я зразумела ўсё ж з узростам:
Няма лепш горада, чым Гродна.

Андрэй СІДАРЭЙКА

У пагоні за ўзнагародай

— Што ты ўсё свае вершыкі пішаш! — накінулася жонка на паэта Міколу Рамашкіна, які сядзеў за сталом і пісаў новы верш пра каханне. — Я была ў кніжнай краме, набыла кнігу амерыканскага пісьменніка Джонсана Сміта «Патаемныя нататкі сакратаркі Эмы». За гэты твор аўтар атрымаў Нацыянальную кніжную прэмію краіны! Калі і ты хочаш стаць нарэшце вядомым і атрымаць хоць якую прэмію ці званне, то і табе трэба пісаць так. На, пачытай!

— А пра што кніга? — запытаўся муж, не падымаючы вачэй з аркуша.

— Як, пра што? — здзівілася жанчына. — Пра гэта самае… Каханне, словам. Вось паслухай, як па-майстэрску трэба пісаць.

Маша адгарнула кнігу: «Зайшоўшы ў кабінет да шэфа, я павольна наблізілася да яго стала. Гузік на маёй блузцы быў расшпілены. Няхай думае, што я сцерва! Я ведала, чаго жадаю!»

Маша цытавала далей. Амерыканскі пісьменнік так па-майстэрску апісваў інтымную сцэну ад імя галоўнай гераіні, што Рамашкін на імгненне запамятаваў пра ўсе вершы на свеце і яму таксама захацелася менавіта такога кахання. Яшчэ б хвіліна, і ён… Але тут жонка прыпынілася.

— Уся кніга пра гэта! — падвяла рысу яна. — З аднаго боку, лухта, а з іншага — прэстыжная прэмія і ганаровае званне.

— За гэта вось?! — здзівіўся Рамашкін.

— Яшчэ аўтар піша дэтэктывы. Так, нічога звышгеніяльнага. Хутчэй наадварот. Што тут скажаш: амерыканцы амаль усе пішуць ці дэтэктывы, ці пра жарсць. Ты таксама так зможаш. Пачнём з нататак беларускага Рамэа.

І, падмыргнуўшы, дадала:

— Я зраблю цябе вядомым і славутым!

— Ды я не змагу так апісаць! — пачаў аднеквацца Рамашкін. — Тым больш я паэт.

— А ты згадай, калі мы… — і Маша пачала надыктоўваць Рамашкіну першыя старонкі будучай кнігі. Рамашкін аж дзіву даваўся: адкуль у жонкі такое ўяўленне? Вядома: бульварных раманчыкаў начыталася! Напэўна, іх аўтары — таксама лаўрэаты невядомых яму прэмій і званняў!

За некалькі гадзін было напісана каля трыццаці старонак.

— Табе і Данцова пазайздросціць! — пахваліў жонку муж. — Можа, таксама пісьменніцай станеш?

— Пра гэта я падумаю пазней. А цяпер пачнём другую главу, — з творчым імпэтам прамовіла жанчына і пачала зноў надыктоўваць мужу радкі будучага бестселера.

Бліжэй да вечара скончылі першую частку. Ушчэнт змораны Рамашкін зваліўся на канапу. Натхненне пісаць вершы знікла. У свядомасці круціліся забытыя словы, якія раней ён баяўся нават падпускаць да вялікай літаратуры і вершаскладання. А сёння ўмомант такой мовай напісаў амаль паўсотні старонак. І, самае галоўнае, ніяк не мог зразумець: чаму такое чытво папулярнае, а іх аўтары атрымліваюць, аказваецца, узнагароды?

Вечарам, крыху адпачыўшы, Рамашкін вырашыў патэлефанаваць знаёмаму.

— Вырашыў Міхаіла Шолахава «Ціхі Дон» перачытаць наноў. Сапраўдная класіка! Тут табе і каханне, і вайна, сапраўдныя чалавечыя пачуцці і пакуты! Не тое, што цяпер некаторыя пішуць! А якое кіно знялі па рамане! Таксама сапраўдны шэдэўр! — падзяліўся той.

Другі сябар, якому патэлефанаваў Рамашкін, чытаў Васіля Быкава «Знак бяды», трэці — Івана Шамякіна «Вазьму твой боль».

— Сапраўдныя, нашы, народныя! А тое — не наш менталітэт. І раўняцца на іх не варта, — падагульніў паэт і, падхапіўшыся, узяў кнігу з патаемнымі нататкамі сакратаркі, занёс яе ў прыбіральню.

«Там ёй самае месца», — падумаў ён.

Вярнуўшыся ў пакой, дастаў з кніжнай шафы «Палескую хроніку» Івана Мележа. Захацелася зноў пачытаць пра Васіля і Ганну.

Распачаты рукапіс не было жадання працягваць.

«Гары ён гарам! І прэмія тая такая ж! Я буду пісаць сапраўдную літаратуру!» — падумаў Рамашкін, і на душы адразу стала лёгка і прыемна.

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Было весела!

— Я чуў, учора ў вас на дачы
Сябры няслаба гасцявалі?
Крычалі, бегалі…
Няйначай
Вяселле нейкае гулялі?

— Не, проста ўчора наш дзядуля
Перакуліў пчаліны вулей.

Вельмі сумная кніжка

— Чаму самотна ты ўздыхаеш? —
У сына бацька запытаў.
— Ды кніжку сумную чытаю! —
Сын, уздыхнуўшы, адказаў.

— А што за кніжка? — бацька зноў спытаў.
— Мо я яе калісьці сам чытаў?
— Чытаў, вядома ж! — сын яму ў адказ. —
«Трыганаметрыя», 10 клас.

Розны вугаль

— Я пахудзець жадаю! Як мне быць?
Мо вугаль актываваны піць?

— Не, вугалем тады вагу зганяюць,
Калі яго не п'юць, а разгружаюць!

Жонцы трэба верыць!

— Чаму ты з жонкай разышоўся, Апанас?
— Спачатку ўсё было нармальна ў нас,
А потым штосьці памянялася ў жыцці…
І не паспею я дамоў прыйсці,
Як жонка пачынае пілаваць:
Што на яе, маўляў, мне напляваць,
І што ў мяне кахання не стае,
Таму ніколі не кахаў яе!
Што я сабе каханку завяду
І да каханкі ад яе сыду!
Мне кожны дзень такое паўтарала…

— І што?
— І ўсё! Пераканала!

Яўген ХВАЛЕЙ

Скрадзеная «нявеста»

Быль

У адным з раёнаў Мінска на трамвайным кальцы, дзе была размешчана казачная кампазіцыя, выкрадзена драўляная скульптура.

Хатка на курыных ножках,
А побач Баба-ёжка
Стаяла — выгляд файны! —
Ля станцыі трамвайнай.

Ды раніцой аднойчы
Не стала Бабы-ёжкі —
Магчыма, летняй ноччу
Гульнуць схацеў хтось з ёю...

Узяў пад ручку, пэўна, —
Не важна, што з мятлою,
І, быццам з каралеўнай,
Прайшоўся над ракою.

Хто ж быў ён, невідзімка?
«Нявеста» — яшчэ тая...
У абцугі-абдымкі
Ўзяла як маладая.

Не вырвешся, халера...
Не аднаму мне здасца:
Давесці «кавалера»
Раз плюнуць ёй — да ЗАГСа.

Людміла КЕБІЧ

Лісічкі

У лесе з'явіліся лісічкі. Вяскоўцы адзін за адным пацягнуліся. Стараліся выйсці з хаты рана, каб нікога з суседзяў не сустрэць. Сашок Васілёў таксама хадзіў па лісічкі, але кожны раз вяртаўся не вельмі задаволены.

— Месцы трэба ведаць, даражэнькі! — кожны раз упікаў няўдалага грыбніка дзед Пецька, калі сустракаў Сашка на дарозе з напаўпустым кошыкам.

І вось аднойчы Сашок, гэты высокі, дужы і даволі ёмкі чалавек сярэдняга ўзросту, натрапіў у лесе на шыкоўную паляну з лісічкамі. Грыбы павысоўваліся з моху і свяціліся, клікалі да сябе, нібы сонейкі. Мужчына не стрымаў радаснай усмешкі, дастаў з кішэні ножык і пачаў завіхацца. Кошык хутка быў поўны, нават з чубам. Сашок дастаў пакет і пачаў зрэзваць лісічкі ў яго, пры гэтым ідучы ў бок дарогі, якая вяла дадому.

Раптам пачуў нейкі шум. Сашок стаіўся і стараўся разгледзець, што дзеецца на дарозе. А ў гэты момант насупраць яго спынілася бабуля на скутары. Нейкая чужая, не з іхняга сяла, ды яшчэ і страшна гарбатая. Яна паставіла мапед каля дрэва, а сама хутка пачала збіраць лісічкі.

«Ну, яна тут няводнага грыбчыка не пакіне!» — падумаў мужчына і пачаў ліхаманкава думаць, як выпудзіць з лесу няпрошаную госцю. І прыдумаў. Сашок закасаў рукавы кашулі, склаў рукі на грудзях і стаў каля дрэва, да якога набліжалася бабуля. У адной руцэ ён трымаў нож.

Збіральніца лісічак нічога вакол сябе не заўважала — грыбы асляпілі яе сваім сонечным бляскам. І раптам яна галавой упёрлася ў нешта мяккае. Падняла вочы і, згледзеўшы разбойніка з нажом і страшным позіркам, дала драпака да дарогі. На скутар яна ўзяляцела, нібы маладая дзяўчына-спартсменка. Сашку здалося, што і гарба ў бабулі не стала. Распрастаўся ад страху хіба?

Макар ШТУКАР

Сказ пра мяшанца-прыстасаванца, невуказнаўца і ашуканца

Сатырычная паэма[1]

Як усё пачыналася

1.

Чытач сучасны досвед мае
Ва ўсіх, няйначай, галінах,
Таму мо чуў ці пэўна знае
Аб бессмяротных мешанцах,

Што ўсё дарэшты ў бруд мяшаюць,
Са свету праўду мкнуцца зжыць,
Пасады розныя займаюць,
Чужыя лёсы каб вяршыць.

Яны, бы трэйлеры, гатовы
Ісці па душах, па касцях,
Раўнуючы жыцця асновы,
Грахамі мосцячы свой шлях.

2.

Мяшанец добра ведаў «справу» —
Дзе падлізаць, дзе ў «лапу» даць,
Лічыўся салдафонам спраўным —
Умеў пад казырок узяць.

Як след каб выслужыцца, шэфу
Партфель дадому дастаўляў
І ладзіў розныя гешэфты,
Бо справу сваю добра знаў.

Таму і быў ён у пашане
Яшчэ ў далёкую пару,
І за такое «прыліжанне»
Ішоў імкліва угару.

Кар'ера рухалася гладка,
І сам круглеў ён пакрысе,
Нібы патульнае цялятка,
Што матак дзвюх адразу ссе.

Любіў дарма ён пажывіцца
І не спыняў сябе пытаць:
«А што, каб з большага карытца,
Ладком прысеўшы, адхлябаць?»

А тут і шанец падвярнуўся —
Здароўе шэфа падвяло.
Мяшанец проста франтам чуўся —
Ну не пазнаць яго было!

Нібы з драбнюсенькай казюлькі
Ператварыўся ў жука,
Што паядае ўвішна «булкі»
Ад цёлкі кормнай ці бычка.

Фартуна бліснула — дагнаўся…
Чаго так мроіў — тое ўзяў…
Да запаветнага дабраўся —
«Пасаг» жаданы атрымаў, —

Заняў фацэтна крэсла шэфа
(Чытач аж выкрыкнуў: — Ого!)
Спрытнюгам, бач, заўсёды шэнціць,
Не ўпусціць бо яны свайго.

«Нарэшце, — думаў, — дачакаўся.
І мой вось зорны час настаў…
Не проста ж так я ў крук згінаўся,
Не проста ж так халуйствам браў…»

3.

І тут жа ўвёў свае законы:
Каб той, хто ступіць на парог,
Не проста біў яму паклоны —
Пластом прад ім мярцвяцкім лёг.

І каб пры тым гатоў быў кожны
Служыць пакорліва яму,
І на паклон не ўшоў парожнім, —
«А не — з пасады ўміг здыму!..»

І захадзілі касякамі
Віжы, падлізы, халуі,
І гімны дружна заспявалі
Перараджэнцы-«салаўі».

Бо дужа добра ўцяміў кожны:
Які то можа быць канец,
Калі цябе харты абложаць
І дасць каманду Мешанец.

Таму зашыўся кожны ў дзірку
І соп у трубачку цішком,
Спадзеючыся, што «казюльку»
Нялёгка вытруціць агнём.

З-за даўняй звычкі-завядзёнкі,
З-за страху, што ў касцях сядзіць,
Стараўся кожны пахвалёнкай
Мяшанцу-шэфу дагадзіць.

Таму, скажу вам, і не дзіва,
Што сваю вотчыну-гамор
Мяшанец наш (о, ліс паршывы!)
Ператварыў у халуйскі двор.

Зрабіў з яе ці то аўчарню,
Ці сабачарню, ці гайню…
І ў гэтым быў ён спец, ударнік,
Дармо, што слізень і шчанюк.

І ўжо ніхто не парываўся
Навуку нейкую рабіць,
Бо кожны толькі і стараўся
Яго ухвалу заслужыць.

Антропы, шаблы і цыханы
Асанну пелі, як маглі,
З надзеяй прагнай, каб Мяшанец,
Крый Божа, іх не абдзяліў,

Каб даў сякой-такой уладкі
І на грудзях сваіх прыгрэў,
А іх вяртлявыя азадкі
Даўбешкай часам не агрэў.

Таму тарчма трымалі вушы
І віжавалі спадціішка, —
Напагатове «свенты душы»
Чакалі шэфава кіўка.

Ва ўсю стараліся, ваўчары,
Са скуры проста лезлі вон:
Баяліся мяшанскай кары
Й таго, што мог падумаць ён.

І ўжо па першай па камандзе
Шалёна кідаліся ў бой
І несліся ў пярэднім радзе
З аскалам лютым і з гразьбой.

— Ату, ату яго! — крычалі. —
У бруд яго! Давай! Мачы! —
Ад злосці сківіцы дрыжалі,
Як у сшалелае ваўчы.

Нібы ў экстазе ці ў адчаі
Шабаш вучоных дзецюкоў
Падобны быў няйнакш на зграю
Сапселых выкармкаў-хартоў,

Што ў дзікім гоне якаталі
Й слюной давіліся сваёй, —
Было каб можна — разарвалі б
І затапталі ў бруд і гной.

Здавалася, што без разбору
Маглі любога парашыць,
Каб толькі даць, як кажуць, фору
І міласць шэфа заслужыць.

А ў гэты час «глаўком» Мяшанец
На троне важна уссядаў, —
Пералiваўся тварны глянец
І ненавісны погляд ззяў.

Дзікун, як блазен, пацяшаўся,
Што аж на твары грала кроў —
Усмак, удосталь захапляўся
Работай верных ганчакоў.

Царком, няйнакш, сядзеў і думаў:
«Ну то ж і гвардыя ў мяне!
Цяпер заядлых іншадумцаў
Хартова кара не міне!

Хай кожны ведае паршывец,
Хто тут сапраўдны гаспадар,
І атрымае свой "гасцінец"
За непакорлівасць — у дар!»

Зусім быў пэўны, што вяльможна
Выносіць можа свой прысуд
І што прад ім прысудны кожны
Не чалавек — пачвара, хлюд.

А ён — адзіны, ён — Мяшанец!
Раўня багам, раўня царам!
Нябёс высокіх ён абранец,
А не якісь аболтус вам.

І хай запомніць гэта кожны,
Хто мае іншы, свой пагляд,
Што жарты тут вадзіць няможна —
Адно яго спаўняй загад!

Сказаць бы толькі прынародна,
Ды так, каб з неба грымнуў гром:
Калі халуйскай ты пароды —
Павек ты будзеш халуём.

І месца тое, што здабыў ты,
Цябе не ўзвысіць да нябёс.
І з часам будзеш ты забыты —
Такі усіх мяшанцаў лёс.

Твае заслугі, псеўдазванні
З патрухай вецер разняце
І там, у вечным спачыванні,
Бясслаўна кануць яны ўсе.

І колькі б нітачцы ні віцца —
Усё роўна знойдзецца канец…
І ўжо не зможа адрадзіцца
Бясслаўны шлях твой, Мешанец.

Працяг будзе.

Малюнкі Алега КАРПОВІЧА

[1] Працяг. Пачатак у № 14, 2024.

У жніўні — пра шчасце

Жнівеньскі нумар «Полымя», намякаючы на развітанне з летам, запрашае паразважаць: што такое сапраўднае шчасце? Думку пра яго чытач заўважыць у шэрагу тэкстаў, што належаць як празаікам, так і паэтам. Заглыбімся ў часопіс, у мастацкія творы, адштурхнуўшыся ад якіх, я паспрабавала вывесці адну надзейную формулу.

Міхась Башлакоў у назве падборкі «Дзякуй Богу за неба высокае» фіксуе агульную настраёвасць сваіх вершаў. Асалоду паэт атрымлівае ад сузірання прыгажосці навакольля, паглыблення ў прыродны свет, што часам «разбаўляюць» успаміны пра сябе маладога. З працэсамі эстэтычнага «ўжывання» ў першааснову быцця, зліцця з ёю асацыіруецца ў аўтара любоў да Айчыны. Лірычны герой прызнаецца, што ўжо няма ў яго былых парываў і памкненняў — такіх, якія сёння ўласцівы маладым людзям, а з каштоўнасцей па-ранейшаму натхняюць толькі творчыя. Звяртае ўвагу ў вершы «Пачатак» дзіцячае ўсведамленне сваёй здольнасці да работы са словам і звязаных з гэтым перспектыў, паспяхова рэалізаваных:

І ўсе свае хлапечыя забавы
На задні план павольна адышлі…
І ў жыце ўжо гняздо звівала слава
Між васількоў, на гомельскай зямлі…

Уладзімір Гніламедаў працягвае публікацыю рамана «У войску», распавядаючы пра падзеі ў арміі, дзе знаходзіцца галоўны герой Платонаў, і ў іншых месцах, напрыклад, у роднай вёсцы, жывуць яго блізкія людзі. Злучае розныя мастацкія прасторы сувязь, якую падтрымліваюць героі: твор насычаны ліставаннем армейца з каханай, са сваякамі і інш. Сталы аўтар дзеліцца глыбокімі думкамі, укладзенымі ў восны герояў, напрыклад: «А ўвогуле жыццё — гэта цяжба з узростам. Старасць не для слабакоў, але чалавек, як паказвае досвед, можа перажыць усё, калі ў яго ёсць на тое воля і жаданне. Вялікае няшчасце — няўменне пераносіць няшчасце» — давайце запомнім гэты апошні сказ, ён ляжа ў аснову абяцанай мной напачатку формулы.

У наратыў уплятаюцца містычныя замалёўкі фальклорнага паходжання пра тое, як душа памерлай гераіні прыходзіць да мужа: на кухні раніцай, на наступны дзень пасля смерці гаспадыні, грукаюць талеркі. Хацелася б, каб гэта развівалася ў літаратуры, таму што магло б прынесці плён, мяркуючы, напрыклад, па поспеху рамана інданезійскага пісьменніка Эка Курніявана «Прыгажосць — гэта гора».

Іна Фралова дорыць чытачу нізку «Вярэдзіць сэрца светлы сум...», у якой знойдзецца трошкі філасофіі («На Браслаўскіх азёрах» — верш, прысвечаны земляку), трошкі захаплення жаночай прыгажосцю («Шыпкоўская Мадонна» — аўтарская адаптацыя знакамітага ў мастацтве і літаратуры вобраза), трошкі атмасферы даўніны, у якой паэтэса, відаць, жыла ў шчаслівым дзяцінстве («Дзед Рыгор»).

Алена Брава ў апавяданні «На ланч да Мэрылін Манро» вяртае ў савецкія часы, даючы пазнакі канкрэтнага перыяду праз увядзенне тэмы Афганскай вайны і выхаду на экраны вядомага фільма 1979 года. На некалькіх старонках разгортваецца трагедыя студэнткі, якая прагне быць каханай, наладзіць асабістае жыццё. Аўтар заглыблена ў псіхалогію: адсутнасць бацькі, адзінота, страта блізкіх абарочваюцца пошукам пяшчоты ў каханні да нявартага чалавека. Немагчымасць справіцца з пачуццямі вядзе да жахлівага падзення з балкона і смерці, якая паказваецца як працяг жыцця. Там, за парогам, дзяўчына знаходзіць супакаенне ў дасягнутым стане патрэбнасці і абароненасці, а яшчэ яе чакае перспектыва ланчу з секс-сімвалам. Відавочна і паралель паміж трагічнымі лёсамі гераіні А. Брава і Мэрылін Манро, нягледзячы на розніцу жанчын у знешнасці, сацыяльным статусе, абедзвюх аб'ядноўвае, словамі У. Гніламедава, няўменне «пераносіць няшчасце».

Своеасаблівы ўнутраны «раздрай» дэманструе і лірычны герой Андрэя Дарожкіна ў першым жа вершы падборкі «Людзі маюць крылы». Малады чалавек гатовы прыняць пацалунак са смакам цыкуты з жаданых вуснаў, якія нібы таямнічая неруш. У выніку асобе, якую на зямным шляху могуць чакаць складаныя сітуацыі (і расчараванне ў каханым, здрада ці адсутнасць узаемнасці — не самыя цяжкія з іх), неабходна выхаваць уменне не ламацца ад напалу сваіх жарсцей, няхай нават выкліканых знешнімі падзеямі — вось і формула шчасця.

У эмацыянальным палоне знаходзімся мы ўсе, асабліва ў турбулентныя перыяды жыцця, таму важна вучыцца, арыентуючыся ў сваіх пачуццях, быць здольным перажыць іх, выстаяць фізічна і псіхалагічна. Гэта і ёсць шчасце, калі не разумець яго ў інфантыльным вымярэнні як лёгкае і салодкае жыццё, у якім усё па-твойму.

Іван Пяшко прапаноўвае мастацкія тэксты «Прынцып» і «Пра шкло, тунэль і кувалду», якія жанрава вызначаюцца як апавяданні. Праблематыка іх апелюе да маралі, пра якую папярэдняя аўтар, дарэчы, зусім не дбае, з'яўляючыся маўклівым назіральнікам (вось як па-рознаму можна падыходзіць да ўвасаблення сваёй мастакоўскай ідэі!). У «Прынцыпе» апісваецца сустрэча былой настаўніцы з вучнем, які канфліктаваў з ёй у школе, ды і цяпер не здолеў устрымацца ад жадання адпомсціць, выходзячы з нейкай сваёй суб'ектыўнай праўды. У творы «Пра шкло, тунэль і кувалду» ўздымаецца этычна нагружаная тэма, з якой масава сутыкнуліся жыхары Беларусі гадоў пяць таму. Незразумелыя фірмы множацца, дурачы пенсіянераў, ды і не толькі, калі прапаноўваюць за вялікія грошы «абслугоўванне пластыкавых вокнаў», як у апавяданні, ці замену аўтамата ў электрашчытку.

Доктар філалагічных навук Галіна Тычко ў навуковай публікацыі «Асоба і творчасць Уладзіміра Калесніка ў кантэксце беларускага літаратуразнаўства другой паловы XX стагоддзя» расказвае пра выдатную постаць гуманітарыстыкі. Спадчына даследчыка дазваляе сцвердзіць, што «беларускае літаратуразнаўства і крытыка ў другой палове XX стагоддзя, насуперак досыць распаўсюджаным меркаванням аб адставанні ад развіцця літаратуры, можна сказаць, у пэўнай ступені дасягнулі свайго росквіту…». Паводле Г. Тычко, У. Калеснік быў інтэлектуалам і эстэтам, заглыбленым у працэс філасофскага спасціжэння свету і сэнсу быцця, ён запачаткаваў разгляд заходнебеларускай з'явы ва ўсім айчынным літаратуразнаўстве. Увогуле ж навукоўцу было ўласціва мудра і аб'ектыўна праз здабыткі літаратуры пазначаць месца беларускага народа ў асяроддзі сусветнай супольнасці.

Вікторыя Сон у артыкуле «Развіццё сучаснай урбаністычнай паэзіі» выказвае думкі пра тое, што горад — гэта своеасаблівы феномен, які можа быць «прачытаны» як тэкст, а таксама як месца спараджэння тэкстаў. Даследчыца разглядае беларускую паэзію ад часоў М. Багдановіча да сённяшніх — твораў В. Шніпа, А. Глобуса і інш. Некалі я пісала, што паэтычныя падборкі ў нумарах «Полымя» прымушаюць здзіўляцца, нібыта і не было XX ст. з яго ўрбанізацыяй і іншымі глабальнымі працэсамі, у якія ўключана наша краіна. Але аўтар сцвярджае, «што беларуская ўрбаністычная паэзія дасягнула ўжо адносна высокага ўзроўню, стала даволі ўпэўненай і трывалай і нават мае ўжо дастатковую спадчыну». Яна гэта пераканаўча даказвае: калі прыгледзецца і заглыбіцца, можна ў сучаснай літаратуры знайсці прыклады выдатнай урбаністыкі, праўда, па-ранейшаму абмежаванай вобразам Вільні, якая нас не «адпускае», і Мінска.

Алена Брава ў апавяданні «На ланч да Мэрылін Манро» вяртае чытача ў савецкія часы, даючы пазнакі канкрэтнага перыяду праз увядзенне тэмы Афганскай вайны і выхаду на экраны вядомага фільма 1979 года. На некалькіх старонках тэксту разгортваецца трагедыя студэнткі, якая прагне быць каханай, наладзіць асабістае жыццё. Аўтар заглыблена ў псіхалогію: адсутнасць бацькі, адзінота, страта блізкіх абарочваюцца пошукам пяшчоты ў каханні да нявартага чалавека. Немагчымасць справіцца з пачуццямі вядзе да жахлівага падзення з балкона і смерці, якая паказваецца як працяг жыцця. Там, за парогам, дзяўчына знаходзіць супакаенне ў дасягнутым стане патрэбнасці і абароненасці, а яшчэ яе чакае перспектыва ланчу з секс-сімвалам. Відавочна і паралель паміж трагічнымі лёсамі гераіні А. Брава і Мэрылін Манро, нягледзячы на розніцу жанчын у знешнасці, сацыяльным статусе, абедзвюх аб'ядноўвае, словамі У. Гніламедава, няўменне «пераносіць няшчасце».

Казімір Камейша працягвае дзяліцца ўспамінамі «Па літфондаўскай пуцёўцы. Кактэбель», чытаючы якія сенняшнія літаратары зноў будуць зайздросціць аўтарытэту пісьменніка ў савецкай дзяржаве, што дазваляла аздараўляцца і назапашваць уражанні творчым людзям за казённы кошт. Згадваюцца вядомыя людзі: Бэла Ахмадуліна, Іван Бунін, Уладзімір Караткевіч і інш. Дзеліцца К. Камейша і сваёй думкай, што «ў музеях ніколі не бывае так, як было ў самім жыцці, так, як хацелася б нам, жывым. Музеі ствараюцца там, дзе ўжо нечага няма, але нам жадаецца, каб яно было, а гэта значыць — заставалася ў нашай памяці». Кактэбель вядомы напаўкаштоўнымі камянямі, што збіраў, гуляючы каля вады, аўтар публікацыі, у памяці якога дагэтуль адбіваецца прыбой.

Міхась Сліва ў працягу рубрыкі «Успаміны» ў тэксце, названым «"Жыццёвінкі" Васіля Ткачова», расказвае чытачам пра празаіка, драматурга, публіцыста, крытыка. Творца доўгі час пражыў на Рагачоўшчыне, стаў яе «ганаровым грамадзянінам», яму прысвячаюцца літаратурныя мерапрыемствы, розныя конкурсы, а дом, дзе жыў, абазначаны мемарыяльнай дошкай. У лёсе аўтара публікацыі знойдзецца некалькі цікавых эпізодаў (напрыклад, уступленне ў Саюз пісьменнікаў Беларусі), за якія ён удзячны свайму сябру, што меў схільнасць дапамагаць маладым аўтарам на іх шляху *per aspera ad astra*.

Рубрыка «Братэрства» гэтым разам акунае ў экзатычную прастору беларуска-туркменскіх літаратурных узаемасувязей. У публікацыі «Пісаць праўду, і толькі праўду...» супрацоўнік часопіса «Дунья эдэбіяты» Джума Мулкаман адказаў на некалькі пытанняў: распавёў пра гісторыю зацікаўлення беларускай літаратурай, у чым немалую ролю адыграла творчасць Васіля Быкава, і паведаміў, што за 2019–2024 гг. пераклаў на сваю мову творы пяці або шасці беларускіх пісьменнікаў. Адразу за інтэрв'ю размешчана апавяданне «Землятрус» у перакладзе з туркменскай мовы Алеся Карлюкевіча.

У рубрыцы «Партрэты» Адам Глобус ушаноўвае памяць пра знанага творцу ў публікацыі «Кляшчук. Словы пра фотамастака Анатоля Клешчука». У шэрагу фрагментаў расказваецца пра гісторыю знаёмства і супрацоўніцтва аўтара з гэтым чалавекам, агульныя спробы вырашаць пытанні з аўтарскім правам, у якіх і сёння яшчэ не расстаўлены кропкі. Адзначаюцца моманты, калі фотамастаку, як і любому творчаму чалавеку, трэба было прыстасоўвацца да імклівых змен у свеце, якія бесперапынна адбываюцца, прымушаючы нас хвалявацца, перажываць, пераадольваць.

Мысляры лічаць: у будучыні ўсіх нас чакае неабходнасць не проста адаптавацца да новага ў прафесіі, а змяняць занятак — нават некалькі разоў за жыццё — у сувязі з тым, што лічбавізацыя і штучны інтэлект будуць адбіраць у чалавека «хлеб».

Алена Чыжэўская ў рэцэнзіі «Кніга, якая нікога не пакіне абыякавым» расказвае пра выданне «Ніколі не забудзем: аповеды беларускіх дзяцей і дарослых аб сваім дзяцінстве ў дні Вялікай Айчыннай вайны». Са шматгалосся ўспамінаў складаецца суцэльная сімфонія жыцця ў тыя часы. Рэцэнзент адзначае разнастайнасць і неаднабаковасць аповедаў, вылучае лейтматыў кнігі: вайна — хвароба, калі розум спіць, а душы апантаны вірусамі жаху і нянавісці.

Мікола Леўчанка ў рэцэнзіі «Доўгія вёрсты жыцця» знаёміць з кнігай Віктара Арцём'ева, які неўзабаве перасягне стагадовы рубеж, «Я — доўгажыхар. Хроніка даўгалецця». У публікацыі прапаноўваецца зазірнуць у жыццёвыя высновы чалавека, які перажыў нягоды сталінскіх рэпрэсій, Вялікую Айчынную вайну, нішчымныя пасляваенныя будні, насычаныя шматлікімі падзеямі ў пакручастай дарозе да роднага слова. Нам абяцаюць апісанні сустрэч з вядомымі літаратарамі, у тым ліку Якубам Коласам, і цікавыя гісторыі з жыцця аўтара з рэцэптамі лекавання і доўгажыхарства.

Надзея Парчук расказвае пра кнігу Анатоля Дзенісейкі «Любоў у агні вайны», што выдаецца другі раз, прэтэндуючы на саісканне абласной літаратурнай прэміі імя У. Калесніка ў намінацыі «Проза». Прыводзяцца добрыя словы пра кнігу вядомых людзей Беларусі, сярод іх — Ігар Лучанок, які прысвяціў аўтару сваю песню.

Наталля БАХАНОВІЧ

Ад рамансаў — да оперы

Неяк па радыё пачуў гутарку з вядомым беларускім паэтам Уладзімірам Карызнам. Вядучая запыталася ва Уладзіміра Іванавіча: «Чаму пра дзяцей выдатных і вядомых людзей часам кажуць, што прырода на іх адпачывае?» Адзін з аўтараў Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, крыху падумаўшы, адказаў: «А вы спытайце ў Марыны Марозавай, кампазітара і мамы двух сыноў. Яна ў інтэрв'ю, якое я нядаўна чуў, заўважыла, што не прырода адпачывае на дзецях. Гэта бацькі адпачываюць на дзецях, займаючыся сабой, сваімі пошукамі ў прафесіі, амбіцыямі, рэалізацыяй сябе. Сабой, а не сваімі дзецьмі. Адсюль і вынік "прыроды, якая адпачывае". Я з Марынай цалкам згодны, яна сваім прыкладам даказала і сама дасягнула яркіх поспехаў у творчасці. І яе дзеці — лаўрэаты міжнародных конкурсаў, цікавыя музыканты і выканаўцы, прадаўжальнікі музычнай дынастыі!»

Больш казаць пра Уладзіміра Карызну не буду, дадам толькі, што ён і аўтар музыкі да асобных сваіх песень. А яшчэ нагадаю, што прырода на яго сыне і ўнуках таксама не адпачывае: добра вядомыя кампазітар Уладзімір Карызна-малодшы, віяланчэліст Іван Карызна і яго сястра скрыпачка Анастасія.

Для тых жа, хто больш хоча даведацца пра Марыну Марозаву, але час хадзіць на канцэрты не заўсёды знаходзіць, заўважу: нядаўна з'явілася кніга «Тихо музыка в дом вошла… Композитор Марина Морозова». Ідэя выпуску яе належыць выдавецтву «Каўчэг» і Уладзіміру Кузьміну, які шмат гадоў яго ўзначальваў.

Пры адсутнасці ў рэспубліцы спецыялізаванага музычнага выдавецтва «Каўчэг» шмат гадоў выконваў і выконвае менавіта такую функцыю. Таму да яго з павагай ставяцца беларускія кампазітары, выканаўцы, педагогі музычных школ і ВНУ. Акрамя нотнай прадукцыі, «Каўчэг» выдае кнігі пра кампазітараў і выканаўцаў, шматлікія *CD*-дыскі з запісамі айчыннай і сусветнай музыкі.

Некалькі гадоў таму ў «Каўчэгу» выйшла кніга пра знакамітага беларускага кампазітара Аляксандра Літвіноўскага, аўтарам якой выступіла журналістка (і шматгадовая супрацоўніца «ЛіМа») Святлана Берасцень. Зборнік пра Марыну Марозаву — своеасаблівы працяг распачатай серыі. Складальнікам новай кнігі выступіла журналістка і паэтэса Таццяна Мушынская нездарма. Яе звязваюць з Марынай гады творчага сяброўства. Кампазітар напісала на вершы Таццяны шмат вакальных твораў, якія выконвалі знакамітыя салісты нашай оперы, а таксама маладыя эстрадныя спевакі. Вынікам супрацоўніцтва дзвюх таленавітых жанчын стала опера для дзяцей і дарослых «Доктар Айбаліт», напісаная паводле твораў К. Чукоўскага і з поспехам пастаўленая на сцэне Вялікага тэатра Беларусі ў 2015 годзе.

Кніга «Тихо музыка в дом вошла…» набывае асаблівую значнасць ужо таму, што яе старонкі як бы напаўняе аўра класіка беларускай музыкі XX стагоддзя Яўгена Глебава, вучаніцай якога Марына Марозава з'яўляецца. Яго імя яна не толькі з удзячнасцю згадвае. Яно як тое жыватворнае паветра, якое сваёй духоўнасцю здатнае тварыць цуды, напаўняе тэксты, прадстаўленыя ў кнізе. Чым больш учытваешся ў іх, тым больш пераконваешся, што вучаніца засталася вартай свайго выдатнага настаўніка, здолеўшы ярка і поўна рэалізаваць сябе ў самых розных жанрах акадэмічнай і папулярнай музыкі. Спіс яе твораў, які прыводзіцца на заключных старонках выдання, можа ўразіць і прафесійнага музыканта, і аматара музыкі, і проста адукаванага чалавека.

Змешчаны і 30 публікацый 17 аўтараў, якія асвятляюць розныя бакі шматграннай творчасці Марыны Марозавай. Сярод іх тэксты аўтарытэтных музыказнаўцаў і музычных крытыкаў Надзеі Бунцэвіч, Наталлі Ганул, Веры Гудзей-Каштальян, Таццяны Мдзівані ды іншых. Аналізуюцца розныя жанры, у якіх кампазітар выступае паспяхова: рамансы, камерныя інструментальныя і сімфанічныя творы, перыяд супрацоўніцтва з Дзяржаўным харэаграфічным ансамблем «Харошкі», мастацкія здабыткі оперы «Доктар Айбаліт». Гэта дыялогі, інтэрв'ю, рэцэнзіі, артыкулы, нататкі, апублікаваныя ў беларускім перыядычным друку — часопісах «Мастацтва», «Полымя», «Нёман», штотыднёвіках «ЛіМ», «Культура» і іншых выданнях.

Амаль палову кнігі займаюць «Воспоминания длинною в жизнь», якія Марынай Марозавай спецыяльна напісаны для кнігі. Чытач атрымлівае магчымасць вярнуцца ў яе дзяцінства, што прайшло ў невялічкім беларускім гарадку Дзяржынску, адчуць няпросты шлях да прафесіі і кансерваторскай адукацыі, радасць творчых адкрыццяў, супрацоўніцтва з вядомымі выканаўцамі і калектывамі. Аўтар знаходзіць цёплыя словы для многіх творчых асоб, якія сустрэліся на яе жыццёвым шляху: вакалістаў, дырыжораў, хормайстраў. Мемуары дазваляюць убачыць яе шматграннай асобай — як творцу, як дачку, як маці двух сыноў.

Гэтыя ўспаміны — без таго глянцавання, якое ўласціва некаторым мемуарыстам. Калі малюецца ўсё так, нібы ніякіх цяжкасцей не ўзнікала, а аўтар напрамую ішоў да сваёй славы. Маўляў, глядзіце — улюбёнец Бога! Ці з іншай крайнасцю. Розныя беды — як тыя, якія былі, так і такія, што нагрувашчваюцца, хоць на станаўленне характару мала ўплывалі. Марына Марозава піша так, як усё было. Канечне, не забывае сказаць словы ўдзячнасці сваёй маці Яўгеніі Канстанцінаўне Марозавай, якой і прысвяціла кнігу.

Кніга «Тихо музыка в дом вошла…» набывае асаблівую значнасць ужо таму, што яе старонкі як бы напаўняе аўра класіка беларускай музыкі XX стагоддзя Яўгена Глебава, вучаніцай якога Марына Марозава з'яўляецца. Яго імя яна не толькі з удзячнасцю згадвае. Яно як тое жыватворнае паветра, якое сваёй духоўнасцю здатнае тварыць цуды, напаўняе тэксты, прадстаўленыя ў кнізе.

Шмат увагі кампазітар удзяляе і сваёй творчасці. Пачынаючы з таго моманту, як з'явілася цікавасць да музыкі, паступова апавядаючы аб тым, як вырашыла прысвяціць сябе ёй. Не хавае, што не абышлося без цяжкасцей. У кансерваторыю паступала двойчы. Першы раз — з такім вынікам, што іншы на яе месцы развітаўся б са сваёй марай. Яна ж, канешне, перажывала, але адступаць не збіралася. Праз пяць гадоў бліскуча здавала кампазітару Уладзіміру Алоўнікаву прадмет «Аналіз музычных твораў». І пацікавілася, ці памятае ён дзяўчынку, якая не ведала імя па бацьку Яўгена Глебава. Як і яго словы, што ў яе няма кампазітарскага таленту.

Жыццёвы шлях рэдка ў каго бывае гладкім. Творчы — не ў меншай ступені. Аднак няўдачы пазбаўляюць упэўненасці толькі слабых. Моцных духам, ды і не пазбаўленых таленту, толькі загартоўваюць. Яскравы прыклад таму — дасягненні Марыны Марозавай. Па-свойму сімвалічна тое, што ў Саюз кампазітараў Беларусі ў 1989 годзе яе прымалі разам з кіраўніком легендарных «Песняроў» Уладзімірам Мулявіным.

Цікавасць будзе выклікаць і візуальны складнік кнігі. Тут партрэты вядомых выканаўцаў, сцэны з праграм ансамбля «Харошкі», сцэны з оперы «Доктар Айбаліт». А таксама фотапейзажы кампазітара, якая захоплена ў апошнія гады гэтым відам творчасці. Дадам, што кніга вельмі годна выдадзена: цвёрдая вокладка, белая папера, больш як 250 старонак тэксту, 32 старонкі каляровых фота (дызайн і камп'ютарная вёрстка вядомага мастака Вячаслава Паўлаўца). Зборнік дае вычарпальнае ўяўленне пра асобу і творчасць Марыны Марозавай, аднаго з самых яркіх айчынных кампазітараў нашага часу. А назву кнізе даў раманс, створаны Марынай Марозавай на верш Таццяны Мушынскай, — «Тихо музыка в дом мой вошла…».

Язэп ЛІТВІНОВІЧ

Чытацкі дзённік Навума Гальпяровіча

Яго нота

Паэзія раптам махне сваім чароўным крылом, і знаёмыя радкі зноў прымусяць адчуць яе харство:

Мне сто вякоў спаткаць цябе карцела.
Мільгаюць тут,
скажы,
з якіх часоў?
Спякотны дзень твайго тугога цела,
Густая ноч жытнёвых валасоў.

Гэта Пятрусь Макаль.

Сёння, на жаль, далёка не кожны нават аматар паэзіі прыгадае гэтае імя.

Я думаў, ты мая турбота,
Лятучая, як ранкам дым.
А ты — высокая работа,
Маёй душы пакутны ўздым.
Я думаў, ты глыток паветра,
Гаючае святло расы.
А ты — гарачы подых ветру,
Якому рухаць парусы.

Пятрусь Макаль… Аўтар шматлікіх кніг паэзіі, якія рэгулярна выходзілі з 1955 да 1995 года, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, драматург, перакладчык. Так сталася, што і ў той час, і пазней большую ўвагу прэсы і чытачоў прыцягвалі іншыя імёны. Макаль быў не тое што па-за ўвагай, яго майстэрства прызнавалі нават мэтры літаратуры, але паэзія не мела, скажам, такі розгалас, як у некаторых аднагодкаў.

Дні, як белыя ватманы,
Перачэрчвае быт.
Прагнуць людзі і атамы
Непамерных арбіт.
Кантрабандай з таверны —
Пырсне слова з пяра.
Выспеў верш безразмерны
У душы песняра.

Хіба гэта не падобна да ранніх вершаў Андрэя Вазнясенскага? А Пятрусь Макаль, у адрозненне ад сталічнага жыхара, архітэктара, сына вядомага інжынера, вучня Барыса Пастарнака, нарадзіўся ў глухой заходнебеларускай вёсцы, у якой сумна глядзелі ў свет хаткі з саламянымі стрэхамі, дзе не было электрычнасці і вечары праходзілі пры лучыне. Пасля жыў у дзіцячым доме, самастойна прабіваў сабе дарогу ў свет навукі, культуры, літаратуры…

Што Макаль майстар метафары, чараўнік слова, можна пераканацца, пагартаўшы яго зборнікі.

— Вы адкуль?
— Мы — ад куль.
Мы — з вайны.
Мы — званы.
Мы — дамы.
Мы — дымы.
Каміны.
Камяні.

Я памятаю , як ён, калі працаваў загадчыкам аддзела паэзіі часопіса «Маладосць», прачытаў мне, пачатковцу, цэлую лекцыю пра патрабавальнасць да слова, майстэрства ў паэзіі. Гэта я потым прачытаў у адной з кніг яго крэда: шукаць найбольш трапныя словы, не дазваляць сабе нават самыя нязначныя моўныя хібы. Калі нешта яго ва ўласнай творчасці не задавальняла, ён на час замаўкаў, каб потым з'явіцца ў друку з новай падборкай.

У слова — свая вага,
Слова — розуму рэха.
Слова — мая туга,
Слова — мая ўцеха.

Я люблю беларускую паэзію. Калі азіраешся на прачытанае, на памяць прыходзіць нямала цудоўных радкоў, нібы чуеш канцэрт з шэдэўраў мастацкага слова.

Дарэчы, гэты вобраз канцэрта я ўзяў з аднаго верша нашага паэта Петруся Макаля:

Няма на зямлі адзіноты —
Пустэчы, падобнай да смерці.
Мы — ноты, мы — ноты, мы ноты
У чалавечым канцэрце...

Яго нота і сёння гучыць светла і чыста.

Леанід КРЫВАНОС

Восеньскае…

Да Дня народнага адзінства

Восень.
Верасень.
Песень
Словы — святочным абрусам.
Былыя ўсходнія крэсы
Спяваюць — мы беларусы!

Восень.
Верасень.
Песняй
Падзеленай колісь Радзімы —
Рэха… гулкае рэха:
Мы — народ адзіны!

Восень.
Верасень.
Песень
Чуецца хор шматгалосны.
Прыгожы народ — беларусаў
Гісторыі выткалі кросны.

Восень.
Верасень.
Песень
Гоман жыццесцвярджальны:
Сямнаццаты дзень верасня
Для Белай Русі — яднальны.

* * *

Гляджуся ў даль гадоў мінулых,
Гартаю часу каляндар, —
Якое шчасце нам паслана —
Жыццё — цудоўны Божы дар.

Яно для кожнага па-свойму
Праходзіць чарадой падзей.
Бывае, што і засмучае,
Але заўжды — не без надзей.

Яно — вось, водарам духмяным
Закружыць раптам галаву,
Альбо за нейкія памылкі
Ўзнясе над намі булаву...

Усведамляю, што жыву я,
Смакую кожны новы дзень,
І з лёгкім смуткам сустракаю
Вячэрні непазбежны цень.

Гляджуся ў далеч год мінулых,
Гартаю часу каляндар.
Чым больш жыву, тым больш цаню я
Жыццё — цудоўны Божы дар.

* * *

Дожджык лье
Каторы дзень.
Непагода.
Неба плача, —
Па асфальце
Дробнай кропляй
Барабаніць нудна,
Скача,
Разганяе
Ў брудных лужах
Эфемерныя кругі
І душу маю
Палоніць
Моцнай хваляю
Тугі.

* * *

Кружыць,
кружыць,
кружыць
Жоўты ліст кляновы,
І убор у дрэваў
Ярка-каляровы.

Ружы,
ружы,
ружы
З аднымі шыпамі,
Нібы пасварыліся
З лепшымі сябрамі.

Лужы,
лужы,
лужы
Тут і там — усюды
Ад дажджу бясконцага,
Хоць ты стаў запруды.

Служыць,
служыць,
служыць
Гэта напамінам:
Лета нас пакінула
З жураўліным клінам.

Буслы

Кружыцца над вёскай
Чарада буслоў.
Развітальнай слёзкай
Дожджык лье без слоў.

Птушкі распрасталі
У паветры крылы,
Бо часы насталі
Край пакінуць мілы.

Над сівой імшарай,
Лесам, полем чыстым
Збор ідзе у вырай
Сумна-урачысты.

Восень адпраўляе
За мяжу буслоў,
І благаслаўляе
Ў якасці паслоў.

Весткі каб разнеслі
Пра свой край лясны,
І дамоў прынеслі
Цеплыню вясны.

Марыя ШАКУН

* * *

Я пакінула сэрца ў тым краі,
Дзе матуля мне песні спявала,
Дзе бацькоўская хата стаяла,
Дзе зязюля на золку кувала.

Маё сэрца навек засталося
Ў тых палях, дзе красуе калоссе,
У лясах, дзе па лісцях у восень
Па грыбы мне хадзіць давялося.

Чыстых мараў дзе ткаліся лёсы,
Дзе ракі задуменныя плёсы,
Сонца дзе на іскрыстыя росы
Рассыпала свае промні-косы.

Мілы край, дарагая мясцінка,
Майго лёсу выток-пуцявінка,
Тут знаёма любая былінка,
Я сама твайго дрэўца галінка.

* * *

Ёсць на зямлі цудоўная мясціна,
Куды мая душа заўжды імкнецца —
Дзяцінства майго светлая краіна,
Малой радзімаю яна завецца.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

У гэтым краі дыхаецца лёгка
І сэрца напаўняецца пяшчотай,
Кранае беларуская гаворка,
А восень зачаруе пазалотай.

Бацькоўскі край, люблю твае прасторы,
Дзе нівы каласяцца на палях,
Дзе падаюць начамі з неба зоры,
Каб расцвісці рамонкамі ў лугах.

Ты гонар мой, мая любоў і казка,
Навуку па жыцці тваю нясу я.
Хай будзе над табою неба ясным
І жыта на палях заўжды красуе.

* * *

Як добра легчы на траву,
Раскінуць рукі
і глядзець у неба,
І радавацца, што жыву,
І большай радасці не трэба.

Сачыць, як воблачка плыве,
Мяняючы сваё аблічча,
Як быццам нешта кажа мне
Ці да сябе ў нябёсы кліча.

Адчуць сябе часцінкаю зямлі,
Кавалачкам прыроды і сусвету,
І растварацца ў сіняй глыбіні.
Плысці, лунаць,
ляцець над светам.

Як добра легчы на траву,
Адчуць сябе часцінкаю сусвету,
Плысці, лунаць, ляцець над светам,
І радавацца, што жыву.

Дэбют

Вольга АЛІЗАР

Гонар

У гэтым свеце, дзе мноства падзей,
Дзе так часта плятуцца інтрыгі,
Мне прыемна глядзець на дзяцей,
Якія чытаюць з цікавасцю кнігі.

Якія трымаюць у шчырых руках
Наша вечнае, добрае слова.
З імі лёгка ў розных кутках
Льецца песняй любая размова.

Яны быццам з другой вышыні
Або нават і з іншага краю.
Ад іх столькі ідзе цеплыні,
Што я сэрцам яе адчуваю.

І хілюся дарослай душой
Да багацця ў яскравым суквецці.
Ганаруся, што побач со мной
Ёсць такія цудоўныя дзеці.

А вяртаюся з працы дамоў,
Мяне сын у дзвярах сустракае.
Дапаможа з вячэрай і зноў
Да цямна і да зорак чытае.

* * *

Ты пакліч мяне, родная вёска, як маці.
Я пачую твой голас, дзе б я ні была.
І прыеду, каб зноў апынуцца
ў той хаце,
Ад якой я калісьці свой шлях пачала.

Я прыеду, каб зноў дакрануцца да сэрца,
Што нястомлена б'ецца
ў глыбінях зямлі.
Каб з лугамі шырокімі ранкам
сустрэцца
І ў букет прывітальны сабраць васількі.

Я прыеду, каб зноў дацягнуцца да лесу,
Што шуміць над маўклівасцю
доўгіх дарог.
Пакланіцца з удзячнасцю
ў ногі маленству
Ды сказаць яму некалькі ветлівых слоў.

Я прыеду, каб зноў прыхіліцца да песень,
Што гучаць у жаночых дасюль галасах.
Я прыеду, мой любы куточак Палесся,
Каб застацца і вершы з любоўю пісаць.

Агеньчык

Нібыта сонейка ўзышло над галавою,
І сэрца першая кранулася вясна.
Мне мала часу, каб надыхацца табою,
Мне мала шэпту,
каб наслухацца спаўна.

Мне мала позіркаў тваіх у мае вочы,
Салодкіх вуснаў і мурашак па спіне.
Збіраю дні з табой на нітачку, а ночы
Яшчэ чакаюць у адкрытым нас акне.

Яны настойваюцца водарам язміна,
Яны плятуць свае каруначкі з травы.
І піша лепшую мелодыю гадзіна,
Ў якой аднойчы будзем разам я і ты.

Ну, а пакуль надвор'е трошачкі хварэе,
Пакуль адлегласць не зматалася
ў клубок,
Няхай агеньчык мой усюды цябе грэе,
А твая сіла беражэ мяне здалёк.

Прывітанне бацькоўскай хаце

З гэтай кухні, дзе ў кубачку стыне гарбата,
З гэтых вулiц, дзе чуецца шум гарадскі,
Шлю табе прывітанне, бацькоўская хата,
Раскажы, як жывуць дарагія бацькі.

Я, прызнацца, без іх вельмі моцна сумую,
Мне ў расстанні здаюцца бясконцымі дні.
Я, канечне, пішу ім і тэлефаную,
Але ў словах не бачу, як свецяць агні.

Як чарговы світанак запальвае сонца,
Як глядзяць яго промнікі ў шкельцы акон,
А за імі любоў, што не ведае донца,
Расцілае да дзетак дзівосны шыфон.

Я не бачу, як зяюць бацькоўскія вочы,
Як усмешка святлом упрыгожвае твар.
Я не чую, як мама пад покрывам ночы
Абдымае малітваю родны абшар.

Я не бачу, як татам складаюцца дровы,
Як з калодзежу ім дастаецца вада.
Паміж намі адлегласць пануе і словы,
У якіх нібы разам, а нібы адна.

Дапіваю паціхеньку з кубка гарбату,
Вырашаю пакінуць прастор гарадскі,
Бо так хочацца сэрцу ў бацькоўскую хату,
Дзе нястомна ля брамкі чакаюць бацькі.

Мае Пугачы

Урыўкі з дзённікавага рамана

Віктар ШНІП

Віктар Шніп заваёўвае ўвагу чытача не толькі сваімі вершамі, але і адмысловай, часам і нечаканай прозай. Яго дзённікавы раман, так паэт вызначыў жанр, — адлюстраванне ўнутранага мастацкага погляду літаратара, яго жаданне праз слова нешта вартае данесці нашчадкам. Здавалася б, такія асабістыя запісы павінны быць цікавыя толькі самому творцу, яго блізкім ці героям тэкстаў. А ўвага шмат шырэйшая... У чым сакрэт такой з'явы? Пытанне, на якое можа даць адказ толькі чытач.

Новыя старонкі дзённікавага рамана — будучая кніга «Заўтра была адліга — 5», якая ў хуткім часе пабачыць свет у адным з выдавецтваў.

12.12.2019. Амаль кожны дзень у сеціве з'яўляецца інфармацыя пра дзяцей, якія сышлі з дому. Мой дзядзька Славік у свой час, будучы школьнікам, часта прападаў. З Пугачоў даязджаў да Масквы, а то і далей. Здымалі з цягнікоў і вярталі ў вёску. Яму хацелася падарожнічаць. Я таксама ў дзяцінстве ўцякаў з дому. Праўда, не ў белы свет, а ў лес. Уцякаў, калі рабіў шкоду. Потым сам вяртаўся, бо холад і голад былі мацнейшымі, чым страх, што мяне пакараюць. Вяртаўся, і, часцей за ўсё, бацькі, пакрычаўшы на мяне, дзе столькі часу бадзяўся, клікалі есці.

25.12.2019. Снілася вёска. Размаўляў з бацькам. Навокал светла. І больш нідзе нікога. Прачнуўся а восьмай. Паспрабаваў успомніць, пра што размаўлялі з бацькам, і не ўспомніў. Цэлы дзень прахадзіў са святлом у душы, якое засталося пасля сну, у якім размаўляў з бацькам…

25.03.2020. Ліда Шніп паведаміла: «Навіна вельмі сумная. Памерла Валянціна Іосіфаўна Шніп, мая цётка, мая настаўніца, Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь, найстарэйшая жыхарка в. Пугачы. Засталася адна мама. І мы асірацелі. Многія тут яе ведаюць, таму паведамляю, што хаваць будуць у пятніцу 27 сакавіка. З 9.00 адпяванне ў в. Пугачы Валожынскага раёна, потым павязуць на могілкі ў Дубровы да дзядзькі Івана (мужа)».

Валянціна Іосіфаўна была стрыечнай сястрой маёй мамы. Вучыла мяне ў школе беларускай мове і літаратуры. Гэта ад Валянціны Іосіфаўны я, дванаццацігадовы хлапчук, на адным з урокаў пачуў, што за дзесяць кіламетраў ад Пугачоў у Вязынцы нарадзіўся Янка Купала. Дачакаўшыся летніх вакацый, я панёс Купалу свае вершы. Неяк пры сустрэчы ў Пугачах Валянціна Іосіфаўна згадала, што я добра пісаў сачыненні і некаторыя з іх у яе захоўваюцца: «Я так і думала, што з цябе нешта творчае павінна атрымацца».

З ранейшых запісаў:

15.10.2011. Ідучы з крамы, спыняюся каля агарода Валянціны Іосіфаўны, маёй сваячніцы, былой настаўніцы беларускай мовы і літаратуры. Цётцы ўжо 83 гады. Жыве адна. Скарджуся цётцы, што ў бацькавай хаце холадна. «А я пломбу сарвала і падключыла ацяпленне!» — кажа Валянціна Іосіфаўна і распытвае пра маё жыццё-быццё. Развітваючыся, думаю падысці да плота, за якім цётка, і пацалаваць яе на развітанне, але чамусьці не падыходжу. Цяпер шкадую, што не падышоў…

27.11.2017. Патэлефанаваў сваяк Анатоль Блашчыцын. Быў у Пугачах. Сказаў, што мая хата стаіць на месцы. Ад яго даведаўся, што сёння маёй дваюраднай цёткі Валянціне Іосіфаўне 90 гадоў. Павіншаваў бы, ды яна ў Пугачах цяпер не жыве, а ў дачкі пад Валожынам. Збіраюцца святкаваць на выхадныя юбілей. Пагаварыўшы пра вясёлае, перайшлі на сумнае. На мінулым тыдні памерла Рэнька Вярбіцкая. Ёй было недзе пад сто гадоў. Пахавалі ў Ракаве на каталіцкіх могілках. З Анатолем прагаварылі амаль гадзіну. Адчуванне, нібыта ў вёсцы пабываў сярод жывых і памерлых, якія ажылі на час нашай размовы…»

4.06.2020. У восьмай сазе пра Караткевіча «Пад небам Ракаўшчыны» Вячаслава Рагойшы:

«Добры знаёмы і сябар Караткевічаў Вячаслаў Міхасёнак (1941—2002), выкладчык роднай мовы і літаратуры Дуброўскай сярэдняй школы Радашковіцкага раёна, краязнаўца і паэт, прапанаваў свой варыянт набыцця лецішча. У недалёкіх ад Ракава Дубровах таксама прадавалася хата. У лісце ад 17 ліпеня 1978 года Уладзімір Караткевіч, у прыватнасці, пісаў у Дуброву, звяртаючыся да Вячаслава: "Нешта ты замоўк. І вершаў не нясеш. А я дужа хварэў. Месяцы два. Хаця адкажы, калі ласка. І яшчэ напішы, як там. Ці не разладзілася справа з той хатай ля крыніцы і ці ранейшая цана. Калі так — магчыма, будзем суседзьмі". Восенню мы селі на "Жыгулі" і паехалі ў Дубровы. Хата, што прадавалася, асабліва яе размяшчэнне — ля крыніцы, на нейкай балацявіне, — не спадабалася ні Валянціне, ні Уладзіміру. Да гэтага ішоў дождж, скрозь было мокра, сыра... Што да В. Міхасёнка, то гэта быў чалавек таленавіты, сапраўдны беларускі патрыёт. Я быў згодны, скажам, з ягоным поглядам на значэнне ў жыцці беларусаў хутароў, на якія пасля вайны апалчылася афіцыйная савецкая прапаганда. І калі ў 1979 годзе я выдаваў свой "Паэтычны слоўнік", то ўключыў туды ў якасці прыкладу наступную страфу з верша В. Міхасёнка "Хутары":

Ў жоўта-зялёным святле гэтай
цьмянай, маркотнае ночы
З рамак няхітрых удумна глядзяць
са сцяны
Вочы дзядзькоў-хутаранцаў,
разумныя, стойкія вочы
Тых, што стаялі за волю,
за праўду сваёй стараны.

Пасля выхаду слоўніка з друку я падараваў яго і Караткевічу, і Міхасёнку. І ўжо тады, калі ні таго, ні другога не стала, прачытаў у публікацыі вядомага маладзечанскага краязнаўцы Міхася Казлоўскага ўрывак з ліста Уладзіміра Караткевіча да яго дуброўскага сябра: «Глядзеў сёння "Паэтычны слоўнік" Вячаслава Рагойшы. Там прыклад на шасцістопны дактыль узяты з тваіх "Хутароў". Слаўны быці пачынаеш».

Лецішча Уладзімір Караткевіч так і не набыў...»

Ад Дуброў да маіх Пугачоў — кіламетраў пяць-шэсць. У маім дзённіку ад 23.05.2014 года ёсць запіс: «Ездзіў у Дубровы. На станцыі Дубровы мяне ўжо чакаў з машынай мой сваяк Леанід Жыткевіч і мой сябра Міхась Казлоўскі. Паехалі паглядзець хату, дзе доўгі час жыў паэт Вячаслаў Міхасёнак. У госці да Вячаслава Міхасёнка нярэдка прыязджаў Уладзімір Караткевіч. Яны сябравалі. Караткевіч нейкі час хацеў купіць каля Дуброў лецішча. Хата Міхасёнка пустая. Нехта нейкі час у ёй жыў, а цяпер прыкмет жыцця няма. Усё зарастае травой і бур'янам. Побач з хатай на вуліцы калодзеж. З яго Караткевіч піў ваду. У суседнім доме жыла жанчына, з якой Міхасёнак сябраваў і якая, калі прыязджаў Уладзімір Сямёнавіч, прыходзіла ў госці. Гаворачы пра гэта, Міхась сказаў: "Відаць, недзе ў хаце, якая пустуе, ці на гарышчы ляжаць кніжкі Караткевіча з аўтографамі. Вось бы паглядзець!" Тут жа Леанід Жыткевіч прапанаваў: "Давайце, калі пачне цямнець, злазім і пашукаем…" Не палезлі. Мы не рабаўнікі». З таго майскага дня праляцела шэсць гадоў. Ці стаяць цяпер у Дубровах хаты Міхасёнка і яго суседкі? Не ведаю.

27.05.2020. На 95 годзе жыцця памёр сын Якуба Коласа — Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч. Светлы быў чалавек і сапраўдны беларус. Згадалася раней запісанае: «8.07.2012. Даслухаўшы мой расповед пра тое, як я ў дванаццаць гадоў хадзіў у Вязынку да Янкі Купалы, каб паказаць яму свае вершы, сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч запытаўся пра назву маёй вёскі. "Пугачы!" — адказаў я і нечакана пачуў, што зімой 1968 года Міхась Канстанцінавіч, будучы за Ракавам на паляванні з сябрам, заблудзіўся. Невядома, колькі б блукалі паляўнічыя, калі б не напаткалі ў лесе на гары хлапчука з санкамі, які на іх пытанне, дзе тут найбліжэйшая вёска, з якой можна выехаць на аўтобусе, адказаў, што непадалёку ёсць Пугачы, і паказаў ім, як туды зайсці. "Дык ці не вы, Віктар, былі тым хлапчуком, які нас выратаваў?" — запытаўся Міхась Канстанцінавіч. "Магчыма!" — адказаў я і расказаў, як у дзяцінстве, катаючыся ў лесе з гары на санках, напаткаў паляўнічых, якія запыталіся ў мяне, дзе тут якая вёска, каб там быў аўтобусны прыпынак, і я паказаў дарогу ў Пугачы. Паўспамінаўшы той далёкі час, мы з Міхасём Канстанцінавічам вырашылі, што нашы гісторыі пра паляўнічых і хлапчука — гэта адна гісторыя пра нас…»

13.06.2020. Праз наш двор час ад часу пралятаюць вятры і калашмацяць дрэвы. Я слухаю шум лістоты. І думаю пра тое, што вось так, бывала, у Пугачах шумелі ў нашым садзе яблыні. І падалі яблыкі ў траву, і ламаліся галіны. Надыходзіла ноч, а вецер не сціхаў. І я ляжаў у ложку і слухаў шум лістоты. Часам было страшна, бо здавалася, што вецер наляціць і разбурыць хату. А потым засынаў, верачы, што ўсё будзе добра. Я і цяпер веру, што ўсё будзе добра. І ўсё будзе добра, як тады, калі ўсе дрэвы былі вялікімі.

29.07.2020. Раніца пахла восенню. Скошаным бульбоўнікам. Згадаліся Пугачы. Мама і тата. І родная хата. І цеплыня. І дабрыня. І ўтульнасць. І сонца над Гайком, куды пад вечар пайду класці вогнішча і пячы бульбу. Для мамы, таты, сястры і брата. І будуць мяне кусаць камары. А я не буду на іх злавацца. У мяне ўсё добра. Я пяку на вогнішчы маладую бульбу для сваіх родных. І ў Мінск вучыцца яшчэ не хутка паеду.

31.07.2020. Туманная жнівеньская раніца. Мне сем гадоў. Зусім нядаўна вярнуўся ад бабулі Ганны да бацькоў у Пугачы, каб ісці ў школу. На пачатку вёскі чуецца музыка. Іду паглядзець, што там робіцца. Блізка не падыходжу, баюся, што мяне заўважаць і будуць пытацца, хто я такі. Каля хаты шмат моладзі. Усе апрануты святочна. Танцуюць, спяваюць. Я вярнуўся дадому і ад мамы даведаўся, што там, дзе гучыць музыка, вяселле. З таго дня праляцела больш за паўвека…

8.03.2021. Калі мне было гадоў дзесяць, у Пугачах у ляску, дзе раслі бярозы, асіны, дубы, рабіны і лаза, я знайшоў маленькую ялінку. Яна была адна на ўвесь лясок. У мяне надзейных сяброў не было. І я пасябраваў з ялінкай. Амаль кожны дзень хадзіў да яе. Распавядаў, дзе і што адбываецца. Нават пра футбол і хакей. Чытаў ёй свае вершы. Скардзіўся, хваліўся, пытаўся, што рабіць, калі ўзнікалі нейкія праблемы. Калі закахаўся ў дзяўчынку, я доўга не прызнаваўся ялінцы, бо не хацеў, каб яна ведала пра гэта. Праўда, пазней прызнаўся. У гадоў пятнаццаць прывёў да ялінкі малодшага брата, каб пазнаёміць яе з ім. І гэтае маё сяброўства з ялінкай нікуды і сёння не падзелася. Праўда, ялінку, калі яна выросла пад метры два (на ёй ужо раслі шышкі), нехта ссек. Я вельмі перажываў. Плакаў. І якая была ў мяне вялікая радасць, калі (мне было ўжо за дваццаць) непадалёку ад маёй загубленай сяброўкі знайшоў маладзенькую ялінку...

9.03.2021. Ліда Шніп напісала:

«Наш дом у Пугачах стаіць на вуліцы "8 Марта". Ніхто не называе па-беларуску "8 Сакавіка" — прывыклі да слоў "8 Марта", ды і ў дакументах так пішуць. Многія ўжо гісторыю назвы вуліцы не памятаюць, нават тыя, хто на ёй жыве. Толькі мама і можа расказаць, па вытоках стаяла, нарадзілася 03.03.1930, і памяць да гэтага дня ў яе фенаменальная. Самая старая вуліца ў вёсцы Цэнтральная, на ёй у 1834 годзе нарадзіўся і жыў з сям'ёй мой прадзед Шніп Адам Рыгоравіч (нагадаю, што дом стаяў насупраць Гайка). Наша ж вуліца ўзнікла прыкладна ў сярэдзіне XX стагоддзя, асноў склалі дамы жыхароў, якія пераехалі з суседніх хутароў. Хтосьці перавёз дом, хтосьці пабудаваў новы. Жылі і жывуць на нашай вуліцы сем'і настаўнікаў, дырэктара школы, канторскіх работнікаў, галоўбуха. Сем'і старшыняў нашага калгаса "Бальшавік" (Макарэвіч, Чаховіч, Лейбінскі, Ладыжэнка, Лужынскі) перыядычна змяняюцца. Дом для іх па суседстве з домам маіх бацькоў будавалі за кошт калгаса. Станіслаў Антонавіч Лужынскі і цяпер жыве на нашай вуліцы, і жыхары вёскі вельмі ўдзячныя яму за тое, што, будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання, ён дамогся, каб у вёску правялі прыродны газ. Цяпер ва ўсіх газавае ацяпленне, дарогі "апрануў" у асфальт, жыхары перасталі дыхаць пылам, вада ў дамах была яшчэ да яго. У вёсцы ў нас жыць стала лепш, чым у горадзе. Адзіны мінус — няма працы, таму моладзь паранейшаму з'язджае ў Мінск. На пенсіі ўсе вяртаюцца са сталіцы жыць у свае маленькія ўтульныя домікі. А яшчэ іх актыўна скупляюць мінчане. Адцягнулася ад гісторыі назвы вуліцы. Бо на нашай вуліцы пасялілася ўся інтэлігенцыя калгаса. У калгас на працу ніхто не хадзіў, вуліца наша была без назвы. Брыгадзір па прозвішчы Мяльгуй з суседняй вёскі Татарскія любіў часта пакрычаць, прыкладна: "Што за вуліца? Кожны дзень у іх свята 8 Марта! Прычым круглы год!" Або: "А ў вас зноў сёння 8 Марта, кожны дзень святкуеце! Вы сядзіцё ў школе, у канторы, а лён пад дажджом гніе! Усіх у нядзелю запрашаем лён падымаць альбо з вучнямі ў будні выходзьце!" Або: "У нас жа цэлая вуліца такая, ну бясконца ў іх 8 Марта! А бульба на палях прападае!" Нагадаю, што праца зусім нядаўна была ручной. У выніку на ўборку гародніны ці лёну выходзілі вучні школы з настаўнікамі. Мы рвалі лён, вязалі, ставілі домікі, потым слалі на палях, потым падымалі, выбіралі бульбу, збіралі з палёў камяні, палолі велізарныя калгасныя палі буракоў. І гэтая праца дапамагала ўсвядоміць неабходнасць вучыцца, усе дзеці з нашай вуліцы скончылі спачатку тэхнікумы, у вёсцы была толькі 8-гадовая школа, потым інстытуты, універсітэты, хто хацеў — аспірантуру. А назва вуліцы "8 Марта" так і замацавалася назаўжды».

Сышліся разам Колас і Купала...

Вядомы адрас літаратурнай памяці, мясціна, якая яднае, кліча ў госці беларусаў Казані і ўсяго Татарстана, — музей Янкі Купалы ў Пячышчах, блізкай ваколіцы Казані. Толькі што тут пры падтрымцы Аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі і ГПЗ «МТЗ — Татарстан» адкрылася выстаўка Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа «Якуб Колас і Янка Купала: зямля і неба беларускай літаратуры».

Фота з сайта vuslon.ru

Удзельнікі мерапрыемства.

На адкрыцці з прывітальным словам да прысутных звярнуўся кіраўнік Аддзялення Пасольства Беларусі ў Расіі ў Казані Віктар Шчэцька. Выступіў таксама і кіраўнік Выканаўчага камітэта Савета Асамблеі народаў Татарстана Рэнат Валіулін. Шчырымі словамі любові да беларускага народа, беларускай літаратуры было насычана выступленне народнага паэта Татарстана, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі, вядомага грамадскага і палітычнага дзеяча Рэната Харыса. Татарскі паэт і перакладчык зрабіў неверагодна шмат дзеля развіцця і ўмацавання беларуска-татарскіх літаратурных сувязей, дзеля захавання творчай спадчыны беларускіх класікаў на мове свайго народа. У 2018 годзе Рэнат Харыс выдаў у Казані зборнік беларускай паэзіі ў сваіх перакладах — «Калі ласка — Хуш кілесез!». Пад адной вокладкай знайшлося месца творам Францыска Скарыны, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Міхася Чарота, Уладзіміра Дубоўкі, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Рыгора Барадуліна, Раісы Баравіковай, Леаніда Галубовіча, Міхася Пазнякова, Валерыя Казакова, Міколы Мятліцкага, Уладзіміра Марука, Віктара Шніпа, Людмілы Рублеўскай, Алеся Бадака, Таццяны Сівец… Усяго 30 паэтаў Беларусі прадставіў чытачу татарскі перакладчык. Уражальнай аказалася і прадмова да кнігі, у якой, дарэчы, Рэнат Харыс напісаў: «Асаблівая цікавасць да Беларусі ўзнікла ў мяне недзе ў 1971 годзе ў перыяд работы адказным сакратаром Саюза пісьменнікаў Татарстана. Тады старшынёю Саюза пісьменнікаў Татарстана працаваў вядомы паэт Закі Нуры… Ён часта ўспамінаў пра сваё “лясное” жыццё ў час вайны, калі змагаўся супраць фашыстаў у партызанскім злучэнні Канстанціна Заслонава — спярша падрыўніком, пасля камандзірам атрада разведкі. Пра гэты перыяд свайго жыцця ён напісаў у кнізе апавяданняў “І мёртвыя помсцілі”. Ганаровы грамадзянін горада Орша Закі Нуры заўсёды падтрымліваў кантакт з беларускімі пісьменнікамі, перакладаў на татарскую мову іх творы і выдаваў кнігі». І далей: «У тыя самыя гады ў вёсцы Пячышчы Верхне-Услонскага раёна на беразе Волгі адкрыўся музей Янкі Купалы, эвакуіраванага ў наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны. У з’яўленні гэтага музея таксама ёсць немалая заслуга Закі Шарафутдзінавіча. У гэтым музеі праз жыццё і творчасць Янкі Купалы для мяне шырэй адкрыліся дзверы ў свет беларускай літаратуры. Побач са знаёмымі па школьных падручніках Янкам Купалам і Якуба Коласам паўсталі Максім Танк, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў і іншыя. Нябачаная бяда, прынесеная фашыстамі на беларускія землі, з неверагоднай сілай адлюстроўваецца ў іх творах і пераўтвараецца ў гімн гераічнай трываласці і жыццялюбству беларускага народа».

З вялікай увагай усе слухалі выступленне дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірыны Мацяс, якая адзначыла непарушную еднасць двух класікаў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Ірына Уладзіміраўна падкрэсліла, што сяброўства ў межах музейнай прасторы Беларусі і Татарстана — гэта і мост, які развівае літаратурную, культурную, нарэшце, народную дыпламатыю паміж нашымі рэспублікамі. Прыемна, што ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь разумеюць надзвычайную вагу міжнародных стасункаў у галіне культуры. Вартае месца ў развіцці сяброўства, музейнага абмену паміж Беларуссю і рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі займае Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

— Калі гаварыць, у прыватнасці, пра Казань, музей у Пячышчах, — зазначае Ірына Мацяс, — то наша сяброўскае, шчырае партнёрства немагчыма без руплівасці кіраўніка гэтай установы Рымы Абызавай. Яна — часты госць у Беларусі, ініцыятар многіх творчых, асветніцкіх праектаў. Такія людзі культуры будуюць нашу еднасць, выклікаюць прыязнасць і ўсталёўваюць добрыя стасункі. Калі кантактуеш з Рымай Абызавай, адразу ўзнікае прыцягненне да Татарстана, Казані, да народа Татарстана…

Экскурсію па выстаўцы «Якуб Колас і Янка Купала: зямля і неба беларускай літаратуры» правяла навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Кацярына Саўчанка. А прадстаўнік беларускай суполкі ў Татарстане «Спадчына» Галіна Барановіч прачытала верш на роднай беларускай мове, а яшчэ падарыла музею ў Пячышчах ручнік, які быў вытканы сто гадоў назад. Кіраўнік «Спадчыны» Сяргей Марудзенка выказаў удзячнасць кіраўніцтву Беларусі і Татарстана за падтрымку і ўвагу да культурных кантактаў паміж рэспублікамі і народамі. Уразіў чытаннем паэтычнага твора на беларускай мове і юны сябра музея, удзельнік многіх мерапрыемстваў у Купалаўскім доме ў Пячышчах Сяргей Бутэнка.

Падзея, што адбылася ў Татарстане, акрэсліла і магчымыя перспектывы развіцця культурных, літаратурных сувязей. «З’яўляючыся членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, — падсумоўвае новы творчы праект Ірына Мацяс, — заклікаю сваіх калег па творчай арганізацыі не забывацца на клопат па ўшанаванні тых беларускіх літаратурных адрасоў, якія ёсць у свеце, якія служаць для нас напамінам, што беларускае мастацкае слова цікава ў многіх куточках. І не толькі ў Расіі, але і ў розных іншых краінах».

Кастусь ЛЕШНІЦА

У розных жанрах

Артур Вольскі (сапраўднае прозвішча Вольскі-Зэйдэль), з дня нараджэння якога 23 верасня споўнілася 100 гадоў, нарадзіўся ў мястэчку Койданава (сённяшні Дзяржынск Мінскай вобласці) у сям’і пісьменніка Віталя Вольскага. У час вучобы ў 25-й Мінскай узорнай чыгуначнай беларускай школе імя А. Чарвякова захапіўся літаратурай і маляваннем. Там выкладаў гісторыю і геаграфію Іван Фёдараў (будучы пісьменнік Янка Маўр), які выхоўваў у вучняў любоў да роднай мовы, знаёміў з культурнай спадчынай нашай краіны. У 1938 годзе А. Вольскі паступіў у Віцебскае народнае мастацкае вучылішча. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, эвакуіраваўся ў г. Уральск, дзе працаваў мастаком у Беларускім дзяржаўным тэатры імя Якуба Коласа. Прызваны ў Чырвоную Армію ў 1942-м. Служыў на флоце на Далёкім Усходзе. Удзельнічаў у баях супраць Японіі, быў боцманам, мінёрам, ваенным журналістам. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалём «За баявыя заслугі».

Пасля дэмабілізацыі ў 1952 годзе вярнуўся ў Мінск і заняўся журналісцкай дзейнасцю. Працаваў у газеце «Чырвоная змена», часопісах «Бярозка» і «Вясёлка». У 1962-м скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1963 да 1966 г. і ў 1992—2000 гг. загадваў літаратурна-педагагічнай часткай Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, у 1966—1978 гг. быў яго дырэктарам. У 1978—1979 гг. дырэктар Дома літаратара, з 1980-га з’яўляўся літкансультантам Саюза пісьменнікаў БССР (з 1955 г. быў яго членам). У 1981—1984 гг. працаваў старшым рэдактарам выдавецтва «Юнацтва». Актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю: уваходзіў у прэзідыум Беларускага тэатральнага таварыства і прэзідыум Савецкага цэнтра Міжнароднай асацыяцыі дзеячаў тэатра для дзяцей і юнацтва, быў членам праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Першыя творы А. Вольскага — апавяданне «Воўчае гняздо» (1937) і верш «Калі б быў бы я паэтам» (1939) — былі апублікаваны ў часопісе «Искры Ильича». У зборніках паэзіі «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982) значнае месца адведзена нялёгкай службе і подзвігам савецкіх маракоў. Шмат вершаў прысвяціў духоўнаму адраджэнню чалавека. Ад кнігі да кнігі расло яго майстэрства. Найбольш ярка яно праявілася ў творах для дзяцей. Зборнікі «Маленькім сябрам» (1955), «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1984),



Артур Вольскі.

«Ад А да Я — прафесія мая» (1987), «Хлеб — усяму галава» (1989) і іншыя пашыраюць кругагляд дзяцей, вучаць працавітасці, паслухмянасці, узаемадапамозе, сяброўству, дабрыні, шчырасці, павазе да старэйшых. Талент А. Вольскага выразна праявіўся ва ўменні арыгінальнымі сюжэтамі і вобразамі ўнікнуць у клопаты дзіцяці, гаварыць яму зразумела, простымі словамі аб праблемах жыцця, бачыць навакольны свет вачыма хлопчыкаў і дзяўчынак, з псіхалагічнай дакладнасцю перадаваць асаблівасці ўспрымання юнымі чытачамі новага і незнаёмага.

Плённа працаваў і ў жанры драматургіі. У суаўтарстве з П. Макалём напісаў п’есы «За лясамі дрымучымі» (1959) і «Марынка-крапіўніца» (1962). Разам з Э. Доўнарам — кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка» (тэлеверсія ў дзвюх серыях — «Пастух Янка», фільм зняты ў 1976 г.). Аўтар п’ес-казак «Сцяпан — вялікі пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семянякам і пастаўлена на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі — першая беларуская аперэта для дзяцей), «Тры Іваны — тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989). На Беларускім тэлебачанні пастаўлены спектаклі «Апошняя ноч Алаізы» (1986), «Водар папараці» (1989). Па творах А. Вольскага было знята некалькі мультфільмаў, найбольш вядомыя сярод іх — «Пра кота Васю и охотничью котовасию» і «Мая мама — чараўніца». Займаўся і перакладамі твораў рускіх і замежных аўтараў. Сярод іх — «Прыгоды Бураціны» А. Талстога, «Чайка» А. Чэхава, «Голы кароль» Я. Шварца, «Маленькі лорд Фаўнтлярой» Ф. Бернет і інш.

Памёр Артур Вольскі 5 верасня 2002 года. Ён узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі, граматамі Вярхоўнага Савета БССР. З’яўляецца лаўрэатам прэміі імя Янкі Маўра.

Кацярына ВАРАНЬКО,
вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Максім Багдановіч. Якім ён быў?..

Часта ў біяграфічных творах альбо ўспамінах можна сустрэць падачу «мой…». І гэта датычыць не толькі агульных гісторый, але і характарыстык. Так, тое, што чалавек мае пэўныя знешнія рысы і індывідуальныя асаблівасці паводзін, яшчэ не азначае, што ва ўспрыняцці іншых людзей яны зафіксуюцца аб'ектыўна, хутчэй застануцца «іх» успамінамі.

Больш за тое, пісьменнікі мінулага, якіх мы ўспрымаем праз творчасць і апісанні іншых асоб, фарміруюць у нас уласнае ўяўленне. Асабліва гэта датычыць персон рамантызаваных, напрыклад, такіх як Максім Багдановіч, што ў сваю чаргу таксама скрыўляе рэальнасць.

Але ж якім быў самы малады геній беларускай літаратуры? Як ён выглядаў, якімі рысамі быў адметны?

Здавалася, што можа быць прасцей?! Трэба проста паглядзець на фотаздымкі Максіма Адамавіча, пачытаць успаміны. Але справа ў тым, што з 18 да 25 гадоў захавалася літаральна чатыры фотавыявы паэта і сумніўны прыжыццёвы накід-партрэт, зроблены ў Крыме ў 1915 годзе, а мемуары бываюць вельмі супярэчлівымі.

Калі да Адама Ягоравіча Багдановіча звярнуліся з пытаннем, якім здымкам праілюстраваць выданне лірыкі яго сына, той адказаў наступнае: «Вы просите совета, какой портрет моего сына М. Богдановича дать в сборник "Лирики". Я посоветовал бы не один дать, а два. Это даст более ясное представление о действительном облике поэта. Приложенный к 1-му тому Твораў взят с фотографической группы 1915 г., т. е. является наиболее зрелым снимком, но он вышел несколько более "крупноплановым", чем был на самом деле, и левый глаз вышел как-то косо. На другом групповом снимке поэт вышел недостаточно ясно, так что этот снимок может иметь только подсобное значение для воспроизведения живописного портрета. А два снимка в особицу тем хороши, что они являются не извлечением, а снимками, так сказать, с "натуры" и дают хорошее воспроизведение его облика, но на них он взят слишком юным. Но если давать один портрет, то тот, который приложен к 1-му тому Твораў. Попытка художника Волкова дать живописный портрет — неплохая попытка, но художник работал без оригинала».

А наступную цытату прыводзім з успамінаў Апалоніі Радкевіч (Савёнак), якая бачыла Максіма на творчых вечарах-«суботніках» у Мінску: «Ён быў зусім не падобны на тых фота, што мы знаходзім тут у нашых эміграцыйных выданнях».

Пэўныя адрозненні ў здымках, апрацаваных партрэтах і вобразе, які захаваўся ў яго памяці, зазначаў і Змітрок Бядуля.

Таму, разгледзеўшы ўважліва выявы, дадзім слова сучаснікам Максіма Багдановіча, якія ведалі яго асабіста (Адам Багдановіч, Дзіядор Дзябольскі, Ціхан Годнеў, Аляксандр Цітоў, Мікалай Агурцоў, Аляксей Залатароў, Яніна Каханоўская, Хведар Імшэнік, Васіль Гарбацэвіч, Ганна Валасовіч-Гразонава, Змітрок Бядуля, Людвіка Сівіцкая, Леанард (Лявон) Заяц, Аркадзь Смоліч, Паўліна Мядзёлка, Апалонія Савёнак, Зыгмунт Абрамовіч, а таксама звесткі ад сучаснікаў паэта ў пераказе Івана Замоціна і Рыгора Жалязняка)[1].

Прапаноўваю вашай увазе звесткі, якія не супярэчылі адна адной (у рэдкіх выпадках падаюцца варыянты) і дазваляюць у больш-менш поўнай форме скласці «аб'ёмны» партрэт пісьменніка ад старшых класаў гімназіі (1909) да яго смерці (1917) з характарыстыкай манеры паводзін і псіхалагічных асаблівасцей.

Максім Багдановіч, 1911 г.

Згодна з апісаннямі сучаснікаў, Максім Багдановіч быў высокі (каля 190 сантыметраў?), худы, з тонкай шыяй і запалымі грудзямі, трохі прыгорблена-сутулаваты, што імкнуўся неяк прыхаваць на людзях. Меў суразмерныя часткі цела і далікатныя прыгожыя рукі.

Рысы твару былі правільныя, з высокім ілбом і «капой» густых хвалістых непаслухмяных цёмна-каштанавых (русых?) валасоў, якія альбо зачэсваў назад, альбо зазвычай прыгладжваў рукой.

Скура была хваравіта бледная (васковая, пергаментная) з чырвоным румянцам у часы хвалявання.

Пад дрымучымі брывамі — глыбока пасаджаныя вочы нявызначанага колеру («блакітнага», «карыя», «шэрыя», «светлыя бяздонныя»), але выразныя, з адметным бляскам і праніклівасцю ў позірку, калі здаецца, што глядзяць праз цябе альбо ўнутр цябе.

Прамы нос, губы — тонкая верхняя і трошкі таўсцейшая ніжняя, а над імі — доўгія «спушчаныя» рыжаватыя вусы. Часам Максім Багдановіч адпускаў рыжаватыя бакенбарды і рэдзенькую бараду (барада ў сям'і Багдановічаў расла слабавата). Вусы пачаў гадаваць адразу па з'яўленні «расліннасці» на твары, што добра заўважна на фотаздымку 1909 года.

Выгляд агулам меў някідкі — шэры, крыху старэйшы за свае гады.

Голас у паэта быў своеасаблівы: ці то нізкі тэнар, ці то высокі барытон, размаўляць любіў, але ў час абвастрэння хваробы прамаўляў мала і прыцішана, стваралася ўражанне, быццам яму не хапала паветра.

На важныя для сябе тэмы выказваўся красамоўна і ўсхвалявана, чым умеў зачараваць сваіх слухачоў. Песні спяваў міма нот, але музыку любіў і добра ў ёй разбіраўся.

Карэктны і ветлівы, ён умеў іранізаваць, а ў сваёй кампаніі жартаваў. Шмат хто апісвае Багдановіча панурым і сур'ёзным, засяроджаным чалавекам, які па-сапраўднаму раскрываўся толькі ў сваім атачэнні. «Сярод блізка знаёмых людзей сарамлівасць яго знікала, але сярод незнаёмых ён рабіўся вельмі сарамлівым. З-за гэтага ён ніколі не бываў на вечарах у гімназіі», — адзначыў Дзіядор Дзябольскі.

Пачуццё гумару Максіма Багдановіча варта адзначыць асобна, як на ўзроўні гульні слоў, так і палёту фантазіі: умеў цягам расповеду маляваць камічныя карціны.

Вусная беларуская мова ў Максіма была слабая, і, гаворачы, збіваўся на русізмы, але ўлаўліваў дысанансы, спыняўся і перапытваў: «Як трэба сказаць гэта правільна?», «прашу, папраўце мяне», пра што згадваў Вацлаў Ластоўскі. Падобныя сведчанні ёсць і ў Хведара Імшэнніка: «Мова М.Б. была чудная; відно было, што ён вывучае яе тэарэтычна і іншае слова праізносіў так, як яно пісалася. Калі француз пачуў бы, напрыклад, імя *"Paul"*, так як яно пішацца, яму гэта было б чудно і мала зразумела, так і я дзівіўся выразам М.Б. і цяпер успамінаю, што яму зусім не даваліся падвойныя літары "дз", "дж". Слова "адраджэнне" вельмі чудно праізносіў М.Б. Але нягледзячы на гэта, М.Б. не траціў інтарэсу да беларускае мовы і прасіў мяне па некалькі разоў паўтараць трудныя для яго словы і выразы. Ён моцна ўслухоўваўся ў самую гучнасць слова, стараючыся спазнаць яго марфалогію». Гэтыя згадкі датычацца 1911—1912 гадоў.

На вопратку звяртаў увагі мала і апранаўся без прэтэнзіі на моду. Мог выклікаць нават ухмылку здзіўлення пры першым з'яўленні. Хадзіў пераважна ў форменнай, спачатку гімназічнай, а потым ліцэйскай адзежы. У старэйшых класах гімназіі касцюм Максіма «сваёй работы» вылучаўся небездакорным выглядам і танным матэрыялам (накшталт мультану). Пазней хадзіў у цёмна-зялёнай (чорнай?) ліцэйскай тужурцы і касаваротцы, у халодную пару ў вечна расхрыстаным старым студэнцкім палітоне («шынялі») ды фуражцы, апранаў доўгія чорныя сподні, боты самыя звычайныя з нізкай халяўкай. У Мінску на працу дадаткова апранаў манішку і белы каўнерык.

З кананічнага вобраза выбіваецца толькі крымская маляваная выява 1915 года, дзе Максім Адамавіч апрануты ў белую сарочку пры гальштуку, фуражку і лёгкую накідку з башлыком.

У манерах яго адчувалася культура гарадскога жыхара.

Знаёмыя характарызуюць Багдановіча як сціплага, зычлівага чалавека, які пры жаданні хутка знаходзіў агульную мову з любым суразмоўцам, мог адшукаць у кожным нейкае зерне, кропкі судакранання, магчымасць праявіць свае найлепшыя рысы, чым выклікаў да сябе сімпатыю і павагу. Хутка прывыкаў да людзей, у якіх ён знаходзіў што-небудзь агульнае з сабою, — адносіўся да іх заўсёды з пашанай. Умеў у вельмі кароткі час стаць блізкім да людзей, зусім не падобных на яго. Адгэтуль жа, з яго абаяння, бяруць пачатак і некаторыя больш інтымныя знаёмствы і сувязі.

Быў незласлівы і мяккі, задуменны, з пяшчотным, амаль жаночым сэрцам.

Захапляўся вобразамі, прыгажосцю, формай, моцнымі пачуццямі і таму часам бурна праяўляў эмоцыі, хаатычна і напорыста. Раздражняўся лёгка, але хутка адыходзіў.

Любіў спрэчкі, з азартам размахваў рукамі і прыціскаў іх да грудзей, а калі не знаходзіў аргументаў, павышаў голас да крыклівасці. Больш за ўсё цікавіўся нацыянальнымі і літаратурнымі пытаннямі, славянскімі мовамі.

«Уцягнуты ў дыскусію, ён рабіўся надзіва цікавым суразмоўнікам, неяк увесь запальваўся і ярка, як "чыстай вады гуманіст", умеў выказваць свае думкі», — адзначаў Зыгмунт Абрамовіч.

Валодаў энцыклапедычнымі ведамі ў розных галінах, умеў абгрунтавана разважаць пра грамадскія і літаратурныя з'явы, выдатна ведаў рускую і еўрапейскую паэзію, хораша (кожны раз па-рознаму) дэкламаваў вершы, якія запамінаў з двух-трох прачытанняў. Не было больш-менш значнага паэтычнага твора, які б ён не ведаў на памяць. Выдатна гуляў у шахматы[2].

Яшчэ з гімназічнай пары хвароба ўвесь час нагадвала пра сябе.

Да сухотаў ставіўся фатальна і за здароўем амаль не сачыў, за прыёмам лекаў часта глядзелі знаёмыя і сваякі, бо сам ён на іх забываўся. У перыяды абвастрэння ў Багдановіча пачынаўся кашаль («канфузліва пакашліваў, стараючыся не звярнуць нічыёй увагі», «калі кашляў, стараўся адысці ад людзей убок»), выступаў пот («пот выціраў бялюткімі насовачкамі») ды ішла горлам кроў, дыханне станавілася кароткім і хрыплым. Часта павышалася і доўга трымалася высокая тэмпература (за 38 градусаў). Выглядаў тады быццам пасля цяжкай працы. У такія моманты дактары раілі яму берагчы сілы — меней прамаўляць і болей спаць, але лекараў, па назіранні сяброў, Багдановіч не слухаўся, спаць клаўся позна. А часам самахоць уводзіў у свой рацыён абмежаванні (пасты), чым выклікаў поўнае непаразуменне таварышаў.

«Бачыце, кажа, вельмі перажываю тое, што я бяссільны памагчы тым, хто цяпер, падчас вайны, церпіць голад, асабліва шкадую дзяцей. Калі я сабе адмаўляю таго, што люблю (бо, прызнацца, люблю салодкую гарбату), мне здаецца, што я раблю нейкую ахвяру, і гэта мяне хоць крыху пацяшае...» — згадвае Людвіка Сівіцкая.

Стараўся трымацца вясёлым і бадзёрым, каб не выклікаць да сябе жалю і не палохаць нікога сваёй хваробай, што выглядала досыць натужна. Пра свой стан гаварыць не любіў, на спробы ўшчуванняў рабіўся непрыемна халодным і так рэзка адказваў, што далей на гэтую тэму не было ніякае ахвоты гутарыць.

Захаваліся неатрэбутаваныя ўспаміны, у якіх Максім Багдановіч так характарызаваў свае адносіны да сухотаў: «Я ўжо пагадзіўся са сваёй хваробай і з тым, што жыць засталося не шмат, але вельмі мне цяжка, што не магу мець сям'і. Я так люблю дзяцей». Па сведчаннях блізкіх, гэтая ідэя ледзь не цалкам займала думкі Максіма напрыканцы жыцця. Пры гэтым рабіў роспачныя агаворкі: «От што я, бадзяга, няпэўны чалавек, хіба мне можна быць бацькам і мужам».

Увогуле, не толькі да здароўя, але і да ўсіх спраў, якія датычыліся яго, ставіўся абыякава.

«У звычайным быту, — піша З. Бядуля, — ён быў бездапаможны, як дзіцё. Хоць зарабляў ён някепска, але харчаваўся вельмі скромна і насіў патрапаны студэнцкі касцюм. На ўсё гэта ў яго быў адзін адказ: "Мільёны людзей пакутуюць на франтах, і я не магу сабе дазволіць добра есці і добра апранацца". Грошы свае ён ціхачом аддаваў галадаючым бежанцам. Сам жыў як сярэдневяковы аскет».

Максім Багдановіч, сапраўды, часта дапамагаў іншым, займаўся дабрачыннасцю, «направа і налева» пазычаў грошы, меў выключную чуласць на чужую крыўду і ў вачах іншых выглядаў ідэалістам-фанатыкам.

Зразумела, што ўспаміны — справа няпэўная, і прыведзеныя вышэй апісанні могуць як удакладніць пэўныя моманты, так і ўвесці ў зман. Але за адсутнасцю іншай інфармацыі (дакументаў, успамінаў, малюнкаў, фотаздымкаў і г. д.) іх варта прыняць да ведама, каб лепш уяўляць таго, хто падарыў нам сваю выдатную творчасць.

Міхаіл БАРАНОЎСКІ

---

[1] Для гэтага аўтар сістэматызаваў усе даступныя згадкі па дадзенай тэме з указаннем аўтарства і крыніцы, а таксама часу, да якога адносяцца ўспаміны. Поўны матэрыял будзе прадстаўлены на найбліжэйшай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай Максіму Багдановічу.

[2] Інфармацыя пра стаўленне да творчасці, гульняў і грамадска-філасофскія погляды разглядаецца ў іншых артыкулах аўтара.

Помнім мы — каб помнілі нашчадкі

Лібрэта гэтай неардынарнай пастаноўкі заснавана на дзённікавых запісах, успамінах і іншых дакументальных сведчаннях удзельнікаў вайны, якія былі перададзены Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншымі музейнымі ўстановамі краіны. У сцэнаграфічным афармленні пастаноўкі выкарыстана мноства матэрыялаў з фота- і кінахронікі, а таксама жывапісныя і графічныя работы нашых вядомых мастакоў: Паўла Масленікава (які яшчэ з даваенных часоў працаваў мастаком-сцэнографам гэтага тэатра), Васіля Шаранговіча, Мая Данцыга і, канешне, Міхаіла Савіцкага, былога вязня нямецкіх канцлагераў, у тым ліку Бухенвальда і Дахау, які на сваіх палотнах пакінуў нам яскравыя сведчанні злачынстваў фашыстаў супраць чалавецтва.

Гэтае вакальна-харэаграфічнае дзейства складаецца з васьмі тэматычна і храналагічна акрэсленых сцэнічных эпізодаў, якія пачынаюцца з пралога і заканчваюцца эпілогам.

У пралогу гучыць інтэрмедыя «Маналог Сучасніка» Алега Хадоскі і фрагмент з вакальна-сімфанічнай паэмы «Вайна не патрэбна» Ігара Лучанка. Перад гледачом паўстае абагульнены вобраз Сучасніка, які ўвасабляе сабой наша калектыўнае «Я»: мы павінны помніць пра кожнага трэцяга, помніць імёны герояў і не забываць пра слёзы і боль дзяцей, якім давялося стаць ахвярамі гэтай крывапралітнай вайны… І як перасцярога гучаць словы *«Вайна не патрэбна, але магчыма…»*, якія заклікаюць кожнага з нас да сацыяльнай і маральнай адказнасці за лёс сённяшніх і будучых пакаленняў. У пралогу выяўляецца і маштаб пастаноўкі, дзе ўдзельнічаюць салісты оперы і балета, артысты хору і міманса, а таксама выхаванцы Дзіцячага музычнага тэатра-студыі. У вобразе Сучасніка — ён праходзіць праз усю пастаноўку як апавядальнік, які звязвае нітку падзей, — выступіў саліст оперы народны артыст Беларусі Станіслаў Трыфанаў.

Погляд на гістарычныя падзеі нашай краіны падаецца ў тым ліку і праз гісторыю самога тэатра. Стваральнікі пастаноўкі аддаюць даніну памяці тэатральным дзеячам, якія стаялі каля вытокаў беларускага акадэмічнага мастацтва, многія з іх былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай. Таму першы раздзел дзейства пачынаецца з даваеннага 1939 года, калі на Троіцкай гары адкрылі грандыёзны

будынак Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларускай ССР. У яго сценах у гэты час ішла падрыхтоўка да вельмі значнай падзеі — Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, якая адбылася ў 1940 годзе.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

І сённяшні глядач назірае, як на гэтай жа сцэне 85 гадоў таму оперная і балетная трупы прадстаўляюць мастацкаму савету розныя па характары і вобразным вырашэнні музычна-тэатральныя фрагменты, найлепшыя з якіх павінны ўвайсці ў вялікую праграму дэкады. Гучыць музыка Мікалая Чуркіна з сімфаньеты «Беларускія карцінкі», але асноўную частку гэтага раздзела складаюць сцэны з оперы Яўгена Цікоцкага «Міхась Падгорны», у якой паказваецца жыццё беларускіх сялян у гады Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі. Самай вялікай удачай названай оперы лічыцца партыя Марысі, і арыю гэтай гераіні ў сённяшняй пастаноўцы выканала народная артыстка Беларусі Анастасія Масквіна. Вельмі каларытна выглядала і масавая вясельная сцэна са сватам і сваццяй, прасякнутая дасціпным народным гумарам. І ў знак завяршэння дэкады прагучала знакамітая песня «Бывайце здаровы…» Ісаака Любана на словы Адама Русака.

Настальгічна-праніклівы настрой даваеннага эпізоду кардынальна змяняецца ў наступным, які носіць назву «На досвітку». Цалкам змяняецца і сцэнаграфія — мірнае неба засланяюць змрочныя сімвалы нашэсця. Тут гучыць музыка Яўгена Глебава — фрагмент з першай сімфоніі «Партызанская» і марш фашыстаў з балета «Альпійская балада», сюжэт якога заснаваны на аднайменнай аповесці Васіля Быкава. Увесь гэты эпізод вельмі выразна вырашаны сродкамі харэаграфіі з удзелам артыстаў балета і міманса.

Наступны эпізод — «Брэсцкая крэпасць-герой» — пераклікаецца з папярэднім. У выкананні хору гучыць вакальна-сімфанічная паэма «Героям Брэста» Генрыха Вагнера на словы Рыгора Барадуліна. На першым плане паўстае сімвалічная постаць Радзімы-маці, якую ўвасабляе салістка оперы

заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Волкава. У гэтым эпізодзе значную драматургічную ролю адыгрываюць артысты міманса ў вобразах юных абаронцаў родных рубяжоў, якія адразу сталі героямі.

А затым ідуць сцэнічныя эпізоды, у якіх адлюстроўваюцца гады нямецкай акупацыі. Загаловак «Кожны трэці» гаворыць сам за сябе. Гучаць інтэрмедыя «Галасы дзённікаў» Алега Хадоскі, вакальна-сімфанічная паэма «Вечна жывыя» Генрыха Вагнера і пранізлівая «Арыя для скрыпкі з аркестрам» Льва Абеліёвіча. Гэта адна з найбольш маштабных і эмацыянальна насычаных сцэн з удзелам артыстаў хору, балета, міманса і выхаванцаў Балетнай школы Вежнавец.

Сцэнічны эпізод «Партызанская балада» таксама ўражвае сваім маштабам і эмацыянальнай насычанасцю, хоць у ім заняты толькі салісты оперы і артысты хору. Напачатку гучыць музыка Уладзіміра Алоўнікава з араторыі «Партызанскія песні», у прыватнасці знакамітая «Лясная песня» на словы Адама Русака: «Ой, бярозы ды сосны — партызанскія сёстры…» Потым — фрагмент з кантаты «Беларускім партызанам» Анатоля Багатырова на словы Янкі Купалы: «Партызаны, партызаны — беларускія сыны…» Істотна ўзбагачаюць гэты блок сцэны з опер. Так, гераіка-патрыятычная опера Яўгена Цікоцкага «Алеся» на лібрэта Петруся Броўкі, заснаваная на партызанскай тэматыцы, ствараласяў час вайны, і яе прэм'ера адбылася ў снежні 1944 года ў вызваленым Мінску. У сцэне з гэтай оперы ў выкананні народнага артыста Беларусі Уладзіміра Громава гучыць знакамітая арыя Апанаса (камандзіра партызанскага атрада): «Над зямлёю закружылі каршуны…» А ў оперы Генрыха Вагнера «Сцежкаю жыцця» па аповесці «Воўчая зграя» Васіля Быкава, напісанай у 1980 годзе, галасы сучаснікаў пераклікаюцца з галасамі народных мсціўцаў. Тыя, хто здолеў прабрацца праз багністыя балоты ў час блакады, не толькі выжылі самі, але і выратавалі жыццё народжанаму пад бамбёжкай сыну камандзіра атрада. Дзіця нарадзілася марозным днём пад адкрытым небам і адразу стала сіратой… Але жыццё і сувязь пакаленняў працягваюцца — вось асноўная ідэя гэтага твора, якая яскрава праяўляецца ў прадстаўленай сцэне.

Памяці ахвяр канцлагераў прысвечана вакальна-сімфанічная паэма «Крывавы бераг» Алега Хадоскі на словы Анатоля Грачанікава. Перад гледачом паўстаюць жахлівыя абрысы дзіцячага лагера, які размяшчаўся ў населеным пункце Чырвоны Бераг паблізу Жлобіна. Пранізліва гучыць голас малалетняга вязня, да якога хутка прыйдзе смерць, у выкананні маладога саліста оперы Андрэя Мацюшонка. У гэтай сцэне заняты артысты хору, балета, міманса, а таксама выхаванцы Балетнай школы Вежнавец, што надае дзейству асаблівую шчымлівасць. Тэме ахвяр канцлагераў прысвечаны і наступны экспрэсіўна-эмацыянальны эпізод — сцэна «Уцёкі» з балета «Альпійская балада» ў выкананні Аліны Рудэнка, Уладзіміра Руда, артыстаў балета і міманса.

Наступны сцэнічны эпізод — «Хатынь» — гэта рэквіем па ўсіх спаленых беларускіх вёсках. Тут іх агульны могільнік, і жалобныя званы Хатыні не даюць забыцца пра трагедыю ўсёй Беларусі. Гучыць фрагмент з араторыі «Бітва за Беларусь» Анатоля Багатырова на словы Ніла Гілевіча «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына». Тэму працягвае музыка з твораў Дзмітрыя Смольскага (фрагмент з сімфоніі № 9) і Алега Хадоскі («Памяці Хатыні»).

У маштабным па колькасці ўдзельнікаў эпілогу гучаць два творы Хадоскі — інтэрмедыя «Пасланне нашчадкам» і вакальна-сімфанічная карціна «Дзе мой край» на словы Уладзіміра Караткевіча. Гэтая фінальная кропка пастаноўкі прасякнута жыццесцвярджальным настроем і запэўніваннем, што памяць пра вайну не мае тэрміну даўнасці.

Зоя МАТУСЕВІЧ
Фота Лізаветы ГОЛАД

Зноў у Белых Росах!

«Белыя росы» — фільм пра любоў да бліжняга, да Радзімы, да самога жыцця — закрануў сэрцы мільёнаў савецкіх гледачоў і не страчвае сваёй актуальнасці і ў наш час. Новы погляд на старую гісторыю ці даніна павагі шэдэўру Аляксея Дударава — што ўяўляе сабой спектакль-чытка «Белыя росы»? Давайце разбірацца.

Сам драматург у шматлікіх інтэрв'ю здзіўляўся папулярнасці свайго сцэнарыя. Гісторыя, напісаная ў спешцы, стала класікай беларускага кінематографа, а назва «Белыя росы» распаўсюдзілася далёка за межы роднай Беларусі.

На першы погляд здаецца, што гэта простая гісторыя пра цяжкія наступствы ўрбанізацыі, якая знішчыла традыцыйны ўклад сялянскага жыцця, душу вёскі. Аднак у цэнтры апавядання — не толькі канфлікт старога і новага, а тэма роднага дома, дзе захоўваецца памяць многіх пакаленняў. І, канешне, каханне, што часта становіцца імпульсам для развіцця падзей.

Побач з высокімі шэрымі хмарачосамі дажывае апошнія дзянькі невялічкая вёска Белыя Росы. Галоўны герой Фядос Ходас — сапраўдны карэнны жыхар гэтага паселішча — хвалюецца за лёс трох сваіх сыноў. Старэйшы Андрэй занадта прагматычны, яго процілегласць — малодшы Васька, занадта інфантыльны, а сярэдні Сашка ўжо 15 гадоў шукае сваё месца па ўсім свеце. Добрая гісторыя з беларускім каларытам дэманструе сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, вучыць любові да бліжняга і з лёгкім гумарам паказвае трагедыю вялікай страты. Жыццё ідзе, цывілізацыя развіваецца, але не ўсе гатовы прыняць гэтыя змены і, як стары Фядос, усім сэрцам цягнуцца да мінулага.

Спектакль-чытка Новага драматычнага тэатра прымеркаваны да 100-годдзя беларускага кіно і 40-годдзя з дня выхаду на экраны мастацкага фільма «Белыя росы». Існуе меркаванне, што новая версія ці працяг класічных твораў загадзя асуджаны на няўдачу. Заўсёды знойдуцца людзі, якім не хапіла цеплыні і атмасферы былога. Аднак у рэжысёра-пастаноўшчыка Лізаветы Машковіч («Вадэвілі», «Дом Бернарды Альба») і мастака-пастаноўшчыка Лідзіі Малашэнка атрымалася перадаць дух легендарнай кінастужкі, спалучыць такія розныя і адначасова такія падобныя віды мастацтва — кіно і тэатр.

Арыгінальным рэжысёрскім ходам стала перадача эмацыянальнага стану герояў праз музычнае суправаджэнне, якое артысты ствараюць пры дапамозе інструментаў і бытавых прадметаў. Меладычныя спевы, гукі гітары, баяна і дрэва зліваюцца ў сапраўдную сімфонію, прысвечаную роднаму дому, глыбокай беларускай душы.

Спектакль-чытка пастаўлены па кінасцэнарыі Аляксея Дударава, таму вядомыя не аднаму пакаленню гледачоў устойлівыя выразы цалкам захаваны ў пастаноўцы Лізаветы Машковіч. Таксама ёсць унікальная магчымасць убачыць сцэны, што не ўвайшлі ў фільм Ігара Дабралюбава. Напрыклад, больш падрабязна паказаны шлях Сашкі дамоў: эпізод са звальненнем (заява дырэктару рыбакамбіната), сцэна ў аэрапорце і інш.

Сны — гэта чырвоная нітка ўсёй кінастужкі, якая звязвае рэальнасць і ўнутраны свет герояў. Лізавета Машковіч выкарыстала гэтыя кадры ў сваёй пастаноўцы, з-за чаго межы паміж кіно і тэатрам пакрыху сціраюцца. Такі прыём яшчэ раз падкрэслівае аснову спектакля, аднак дазваляе абыграць стары эпізод з новымі эмоцыямі. Кадры з фільма, як цені, суправаджаюць герояў на сцэне (а можа, акцёры — гэта толькі цень былой велічы кінакарціны?).

Тэатральны жанр «чытка» апошнім часам набірае папулярнасць як сярод рэжысёраў, так і сярод гледачоў. Спектакль-чытка развіваецца, набывае новыя рысы, выходзіць за агульныя межы і, магчыма, у хуткім часе будзе на адным узроўні з класічнымі тэатральнымі жанрамі. Пастаноўка Новага драматычнага тэатра «Белыя росы» — не проста статычныя акцёры з белымі паперкамі ў руках. Гэта зусім іншы погляд на жанр, дзе з мінімальнымі дэкарацыямі, аднак з сапраўдным акцёрскім майстэрствам гісторыя ажывае ў фантазіі гледачоў. Спектакль-чытка — быццам сумесная праца артыстаў і публікі, таму што эмоцыі кожнага ўплываюць на агульную атмасферу пастаноўкі.

У «Белых росах» задзейнічаны Сяргей Шырочын (Фядос), Васіль Ніцко (Цімафей), Дзмітрый Кузняцоў (Сашка), Фёдар Пясецкі (Вася), Дзмітрый Ціхановіч (Андрэй), Данііл Казак і Сцяпан Краўчук (Мішка Кісель). Канешне, ролі ўмоўныя. Акрамя галоўных герояў, у спектаклі шмат другасных і эпізадычных персанажаў, што спачатку можа заблытаць, але з развіццём сюжэта толькі прыцягвае ўвагу гледачоў (асабліва ў моманты, калі акцёрам трэба паказаць каруку ці сабаку Валета). Трэба адзначыць талент Надзеі Анціповіч, лаўрэата Нацыянальнай тэатральнай прэміі, вядомай па спектаклях «Вадэвілі», «Лялечны дом», «Плачу за каханне» і інш. У карціне «Белыя росы» Надзея сыграла ўсе жаночыя ролі: і жонку старэйшага брата, і Марусю, і паштальёнку Верку, і нават сур'ёзную прадстаўніцу мясцовай улады. Кожны персанаж у яе выканні мае свае рысы, эмоцыі і пачуцці.

У спектаклі шмат папулярных кампазіцый савецкіх часоў: «Мой адрес Советский Союз», «Трава у дома», «Малиновка»; паэзія Арсенія Таркоўскага, Марыны Цвятаевай і, вядома, любімы хіт «Страдания» на словы Міхаіла Таніча і музыку Яна Фрэнкеля.

Пастаноўка Новага драматычнага тэатра — не спроба паўтарыць ці палепшыць знакаміты фільм Ігара Дабралюбава. Гэта спектакль-настальгія, дзе кожная рэпліка — удзячнасць кінематаграфічнаму феномену, павага да легендарных акцёраў і аўтараў карціны. Персанажы спектакля лёгка балансуюць паміж іроніяй і сумам, уласнымі пачуццямі і ўжо звыклымі вобразамі, ствараючы цікавую меладраматычную гісторыю са знаёмымі героямі, але іншым настроем.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА,
фота аўтара

Падарункі да дня нараджэння

Купалаўскі тэатр адсвяткаваў 104-ю гадавіну з дня свайго заснавання. Да гэтай даты купалаўцы прымеркавалі шэраг урачыстых мерапрыемстваў.

Так, на фасадзе будынка з'явіліся вялікія плакаты з летапісам Купалаўскага тэатра. Цяпер прахожыя могуць азнаёміцца з асноўнымі перыядамі развіцця знакамітага тэатра, убачыць партрэты славутых артыстаў-купалаўцаў мінулага стагоддзя, даведацца пра падзеі, якія сфарміравалі Купалаўскі як феномен тэатральнага мастацтва. Адлюстравалі гісторыю найстарэйшага тэатра. У бельэтажы купалаўцы прэзентавалі партрэтную галерэю самых знакамітых артыстаў, рэжысёраў і мастакоў за 104 гады існавання тэатра. Ідэя стварэння галерэі належыць народнаму мастаку Беларусі, галоўнаму мастаку Купалаўскага тэатра Барысу Герлавану. Па яго задуме, партрэты артыстаў размяшчаюцца ў тым жа парадку, у якім самі дзеячы мастацтва прыходзілі служыць у тэатр. Асобна прадстаўлены фотаздымкі Фларыяна Ждановіча, Еўсцігнея Міровіча, Уладзіміра Крыловіча, Канстанціна Саннікава, Льва Літвінава і Валерыя Раеўскага — людзей, якія стаялі каля вытокаў Купалаўскага. Барыс Федасеевіч прыйшоў у тэатр яшчэ ў 1950-х гадах і памятае мноства артыстаў з гэтых фотаздымкаў:

— Вось заснавальнікі, якія адкрывалі тэатр, — Платонаў, Глебаў, Яроменка, Браварская, Малчанаў... Усе яны выдатныя акцёры, заслужаныя, народныя артысты. Праз партрэты перадаюцца пачуцці акцёраў, эмоцыі, перажыванні. Дзякуючы гэтым людзям наш тэатр быў на ўздыме, лічыўся пятым на ўвесь Савецкі Саюз. Купалаўскі добра ведалі і за мяжой, запрашалі да сябе. Трупа сабралася выдатная, было цікава назіраць за працай, рэпетыцыямі. Гледачы тэлефанавалі і пыталіся, ці выйдзе сёння на сцэну той ці іншы акцёр, калі можна будзе ўбачыць яго ў пэўнай ролі? Прыходзілі паглядзець не спектакль, а акцёраў. Прайшло шмат гадоў, але і цяпер так робяць.

Уражаннямі ад галерэі падзяліўся і генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Аляксандр Шастакоў:

— Гледачы, прыходзячы на спектаклі, змогуць убачыць галерэю — гісторыю развіцця тэатра ў асобах, прыгадаць вядомыя імёны і натхніцца гэтак жа, як натхняемся мы. Многія супрацоўнікі, як і Барыс Федасеевіч, штодзень сустракаліся з гэтымі артыстамі, дапамагалі ім, і сёння ўсім вельмі прыемна ўспомніць тыя гады і тую частку свайго жыцця, звязаную з легендарнымі для краіны асобамі. Вось, напрыклад, партрэт Здзіслава Стомы — вядомага артыста, які быў часткай трупы Купалаўскага і прымаў удзел у стварэнні спектакляў. А яго сваячка таксама працуе ў тэатры. Людзі прыходзяць да нас і дыхаюць гісторыяй, шануюць і захоўваюць традыцыі.

Нагадаем, што на першым паверсе Купалаўскага знаходзіцца шэраг фотаздымкаў артыстаў, якія служаць у тэатры сёння. Так, у адным месцы сустракаюцца мінулае і сучаснасць.

Таксама ў гэты дзень адбылося важнае мерапрыемства — падпісанне пагадненне аб творчым супрацоўніцтве паміж Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы і Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы. Абедзве ўстановы аб'ядноўвае не толькі імя народнага песняра БССР, але і той факт, што гэты год стаў для іх юбілейным (у Купалаўскім тэатры распачаўся 105-ы сезон, Купалаў дом адзначыў 80-годдзе з пачатку дзейнасці).

— Здаецца, мы сёння разам з Купалам. Ён быў найлепшым сябрам творчага калектыву, наведваў спектаклі, прысутнічаў на рэпетыцыях, удзельнічаў у абмеркаваннях і заўсёды дапамагаў акцёрам і рэжысёрам далучыцца да гісторыі роднага краю, багацця фальклору. У наступным годзе мы будзем адзначаць 100 гадоў з моманту прысваення Янку Купалу звання народнага паэта, пастанова была прынята 10 чэрвеня 1925 года, а святкавалі якраз у Беларускім дзяржаўным тэатры 23 чэрвеня 1925 года. Сёння працягваецца сяброўства Купалавага дома і Купалаўскага тэатра, і пагадненне аб супрацоўніцтве паміж нашымі ўстановамі — гэта крок да ўмацавання нашых адносін у рамках сацыяльных праектаў. Разам звяртаемся да новых форм, імкнёмся да ўкаранення інавацый і будзем развівацца ў гэтым напрамку, — падкрэсліла дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна Галінская.

Адразу пасля падпісання пагадненне быў прэзентаваны першы сумесны праект: адкрыццё «месца Купалы» ў ложы глядзельнай залы. Супрацоўнікі музея Янкі Купалы знайшлі ў архівах згадку, што Пясняр сапраўды выбіраў пэўнае месца падчас сваіх візітаў у тэатр. Цяпер яно будзе пазначана спецыяльнай шыльдай. У якасці падарунка тэатру Ганна Васільеўна ад імя калектыву музея Янкі Купалы ўручыла дырэктару тэатра ліст з успамінамі Ларысы Гарэцкай, які сведчыць, што гэта сапраўды тое самае месца, на якім сядзеў Купала: «Амаль нязменна сустракаліся з Янкам Купалам, які звычайна сядзеў у левай ложы, каля самай сцэны». Першым, хто заняў гэтае асабліваe месца, стаў ганаровы госць Купалаўскага тэатра — унучаты пляменнік народнага паэта Віктар Аўлачынскі. Ён жа ўрачыста адкрыў «месца Купалы».

— Хачу выказаць удзячнасць усім супрацоўнікам музея і тэатра за памяць аб творчасці Янкі Купалы! Вялікі дзякуй, што запрасілі мяне на гэтую сустрэчу! — адзначыў Віктар Мар'янавіч.

Дар'я ТАЛАЛАЕВА
Фота даслана аўтарам

Ад артыста-пачаткоўца да сапраўднага майстра

У аднаго з найбольш вядомых і запатрабаваных артыстаў коласаўскай трупы Генадзя Іосіфавіча Гайдука не толькі асабістая важная дата, ён святкуе і 40-годдзе сваёй творчай дзейнасці.

Пройдзены вялікі шлях: ад артыста-пачаткоўца да сапраўднага майстра, які здольны выканаць самыя складаныя прафесійныя задачы. А як жа ўсё пачыналася? Наўрад ці ведаў у дзяцінстве вясковы хлопчык Гена Гайдук з Міншчыны, што такое тэатр і прафесія артыста. Меў выдатныя тэхнічныя, інжынерныя здольнасці, любіў круціць розныя шрубкі, болцікі і ў шэсць гадоў нават зрабіў сабе трактар. Сябры і мянушку яму адпаведную далі — Гайка. У школе добра цяміў у матэматыцы. Але разам з тым хацелася паказваць розныя сцэнкі і мініяцюры, быць публічнай асобай. Гэта і вызначыла выбар жыццёвага шляху. У тэатральна-мастацкі інстытут паступаў двойчы: толькі з другога разу трапіў на курс выдатнага педагога Аляксандра Іванавіча Бутакова, які для многіх студэнтаў быў сапраўдным бацькам. Але нават найлепшыя з найлепшых не могуць навучыць быць акцёрам, гэта можна адолець толькі самому, лічыць Генадзь Іосіфавіч. Трэба засвоіць у педагогаў аснову, а ўсё астатняе падгледзець, прыдумаць. У настаўнікаў юнак пераняў асновы майстэрства, але сапраўдным акцёрам стаў, ужо трапіўшы на коласаўскую сцэну.



Генадзь Гайдук.

Дэбютаваў у ролі Лёнькі-Адуванчыка ў спектаклі «Радавыя» па п'есе Аляксея Дударава. Гэта наіўны, непасрэдны, закаханы ў медсястру хлапчук. Потым быў цэлы шэраг маладых герояў: Алёша ў спектаклі пра падлеткавае каханне «Маскоўскія канікулы» А. Кузняцова, шэкспіраўскі Бенволіа з «Рамэа і Джульеты», Вася («І быў дзень…» А. Дударава), Іван («Сняданак з невядомымі» У. Дазорцава), Адзінцоў («Тры гадзіны на сачыненне» А. Крумера, М. Міхайлава). Многа іграў у казках, дзе набыў неблагі прафесійны вопыт: увасобіў на сцэне Пачвару («Дарога з чорнага царства» А. Вярбеца), Бураціна («Навагоднія прыгоды з чароўнай скрыначкай» Ю. Куліка, А. Оксіня), Лесуна ў «Купальскай ночы» Ю. Куліка, Казла з «Кошчынага дома» С. Маршака, Шэрае Мышаня ў «Дні нараджэння ката Леапольда» Аркадзя Хайта, на больш познім этапе — Доктара Айбаліта ў аднайменным спектаклі па кінасцэнарыі Р. Быкава і В. Карастылёва, Зюзю-Зімавіца ў музычнай казцы «Вядзьмарка і Дыназаўрык» А. Якімовіча.

Але вось пайшлі больш грунтоўныя ролі, такія, як Хлестакоў у эксперыментальным спектаклі «ЧП-1» — «ЧП-2» паводле «Рэвізора» М. Гогаля ў пастаноўцы выдатнага рэжысёра Барыса Эрына, пазней Освальд у трагедыі «Грахі бацькоў» паводле п'есы Г. Ібсена «Здані». Увогуле, у «Рэвізоры», па задуме рэжысёра, суіснавалі чатыры Хлестаковы. Гэта ў нейкім сэнсе адлюстроўвала гогалеўскую фантасмагорыю і містыцызм. Кожны з выканаўцаў ролі ўвасабляў нейкую адну рысу — інфернальнасць у Вадзіма Асвяцінскага, інфантыльнасць і рамантычнасць у Генадзя Кірпічова, ганарлівасць і самаўпэўненасць у Міхася Краснабаева, гіпертрафіраваная жаноцкасць у Генадзя Гайдука. Паступова вобраз абрастаў і іншымі рысамі — цынізмам і рафінаванасцю. А праз некалькі гадоў — паглыбленне ў псіхалагізм і трагічнасць ібсенаўскага персанажа Освальда. Яго герою ўласцівы вонкавы, знешні спакой. Страціўшы апошнюю надзею на выратаванне, ён усё прадумаў, разлічыў і прыехаў дадому паміраць. Вестка аб тым, што выбранніца Рэгіна з'яўляецца яго сястрой, не вельмі хвалюе Освальда. Жыццелюбівая, адчайная дзяўчына неабходна яму толькі для таго, каб у патрэбную хвіліну даць выратавальную атруту. Але ад'езд Рэгіны парушае ўсе яго планы. Тады са страшнай прапановай сын звяртаецца да маці. Освальд на сцэне зусім пазбаўлены нервовай узбуджанасці, экзальтацыі, істэрыі. Толькі незямны сум у вачах ды ледзь прыкметная пакутлівая грымаса, што часам скажае яго прыгожы твар, выдаюць нясцерпны душэўны боль. Освальд мяккі, разважлівы, мудры, таму што ў думках сваіх ужо даўно пераступіў мяжу небыцця. Выкананне Генадзя Гайдука ўражвала глыбінёй, напоўненасцю, прыхаваным драматызмам.

Акцёр з поспехам працаваў у самых розных жанрах: — псіхалагічнай драме, лірычнай камедыі, абсурдысцкім трагіфарсе альбо казцы. Так, у спектаклі «Блэз» па п'есе французскага драматурга Клода Манье ён яскрава выконваў ролю галоўнага героя. Малады мастак містар Блэз арандуе кватэру, каб са сваёй дамай сэрца здзейсніць нейкую аферу. Ён задумаў жаніцца з дачкой яе багатага палюбоўніка. Але іх планы руйнуюцца, і Блэз вымушаны выкручвацца самымі рознымі спосабамі. Лёгкі жанр, камедыя становішчаў? Так. Але гэты жанр вымушае акцёра трымаць сябе заўсёды ў форме. Тут мы ўспамінаем знакамітых французскіх комікаў, якія нават у вельмі прымітыўных фільмах маглі трымаць увагу гледачоў, выклікаць любоў ці прынамсі сімпатыю да сваіх няўдачлівых персанажаў.

У тэатры Генадзь Іосіфавіч быў заўсёды загружаны, творчага прастою не ведаў, хоць не ўсе работы прыносілі сапраўднае задавальненне. Найбольшую папулярнасць, цёплыя водгукі крытыкаў і гледачоў атрымаў вобраз Марка Шагала. З гэтым спектаклем («Шагал… Шагал…» па п'есе У. Драздова «Прамы цягнік да Парыжа з усімі перасадкамі») тэатр аб'ехаў мноства краін: Вялікабрытанія, ЗША, Францыя, Італія, Польшча, Малдова, Расія, Літва, Латвія. На Міжнародным фестывалі ў Эдынбургу (Шатландыя) ён атрымаў Гран-пры ў праграме «Fringe». Артысту давялося паказаць славутага мастака ў розныя перыяды. Спектакль быў пабудаваны такім чынам, што Марк бачыць розныя малюнкі віцебскага жыцця быццам праз прызму сваёй свядомасці. Першае ў жыцці юнацкае захапленне — Волечка, каханне да Бэлы, развітанне з роднымі і, вядома ж, Віцебск — самы дарагі для яго горад, любімая, ды, на жаль, пакінутая ім радзіма, якая прыходзіць у снах, вершах, малюнках, непазбыўнай настальгіі. Генадзь Гайдук стварыў тонкі, пранізлівы, светлы і вельмі аб'ёмны вобраз найперш праз унутранае перажыванне, праз дакладнае ўзаемадзеянне з іншымі акцёрамі, у выніку чаго атрымаўся сапраўдны ансамбль.

Працуючы над вобразам славутага фізіка Эйнштэйна ў спектаклі «Прывітанне, Альберт!», артыст перачытаў многа кніг, сядзеў у інтэрнэце, затое лепш за ўсіх у тэатры ведаў тэорыю адноснасці і мог за лічаны час растлумачыць, што такое фатоны і кванты. Ведаў, што толькі так можна дайсці да самай сутнасці ролі. Увогуле, перыяд працы ў тэатры мастацкім кіраўніком Віталя Баркоўскага лічыцца часам акцёрскага, выканальніцкага ўздыму і Генадзя Гайдука, калі раскрыліся яго здольнасці як драматычнага артыста. Да ўжо названых варта дадаць вобразы зноў жа мастака Хаіма Суціна з «Мадам Боншанс» У. Драздова, Пракурора («От цо да…» па п'есе С. Яновіча «Арышт»).

На сучасным этапе такімі сталі ролі Пата Дулі ў «Каралеве прыгажосці з Лінэна», Віктара ў «Восеньскай санаце» І. Бергмана, Толі ў «Пахавайце мяне за плінтусам» П. Санаева. У п'есе Мак-Донаха артыст надаў сваёй ролі сапраўдны аб'ём, шчымліва-пранізлівае, драматычнае гучанне. Перад намі зусім не класічны герой-палюбоўнік, артыст акцэнтуе ўвагу на яго добрых чалавечых якасцях: ён з самага пачатку спрабуе зразумець Морын і правільны гульні, якую тая вядзе з ім. Вядома ж, яна больш пачуццёвая, больш ахопленая жаданнем, жарсцю, а ён трапляе да яе ў палон. Герой адчувае сябе даволі няўпэўнена і няёмка ў той канфліктнай сітуацыі з маці, у якую міжволі трапіў. Пэўна ж, гэтая ноч змяніла і яго адносіны з Морын, і яго ўласную самаацэнку. У другой частцы спектакля, калі Пата чытае свой ліст да Морын, дзе робіць ёй прапанову быць разам, абяцае светлы рай, верыш у шчырасць яго намераў, у сапраўднасць пачуцця. Пры ўсёй слабасці характару гэта ўжо ўяўляецца смелым крокам, учынкам, які мог бы ўратаваць яе, ды стаў прычынай згубы. Здольнасць падпарадкаваць сябе абставінам, у якія трапляе герой, выяўляецца, апрача названых спектакляў, у «Афінскіх вечарах» П. Гладзіліна (Барыс Алегавіч), «Загадкавых варыяцыях» Э-Э. Шміта (Эрык Ларсен), «Леанарда?» Э. Флізара (Крывы), «Глыток чужога віскі» Л. Агулянскага (Рычард). Цікава, што нават у камедыйных пастаноўках апошніх гадоў — «Доктар філасофіі» Б. Нушыча (Благае), «Дурнічка» Лопэ дэ Вега (Турын), «Бальніца на краі свету» Х. Бойчава (Дзед) ды іншых — артыст не захапляецца абыгрываннем камічных сітуацый. Ён спрабуе зразумець чалавека, вобраз якога ён стварае, яго мінулае, абставіны, у якія ён трапляе воляй лёсу, логіку паводзін. Пад маскай клоўна альбо камедыйнага героя артыст заўсёды выяўляе драматызм.

У спектаклі «Смешныя людзі», пастаўленым паводле аднаактовых жартаў Антона Чэхава, рэжысёр Юрый Пахомаў даручае акцёру ролю Нюхіна. Ім пачынаецца дзея, ён працягвае спектакль пасля антракту і завяршае на журботна-шчымлівай ноце фіналу. Менавіта гэты маналог, дзякуючы контрасту, дазваляе, прымушае іначай зірнуць і на герояў іншых вадэвіляў — так бы мовіць, абсалютна камедыйных. У 2023 годзе спектакль «Смешныя людзі» з поспехам прайшоў на міжнародным фестывалі «Меліхаўская вясна». Прывядзём словы старшыні экспертнага савета фестываля, заслужанага артыста Расійскай Федэрацыі Юрыя Колышава, сказаныя пры ўручэнні ўзнагарод і адрасаваныя Генадзю Гайдуку: «Мне хочацца вылучыць аднаго акцёра, які нагадаў мне вялікую школу рускага нацыянальнага псіхалагічнага тэатра».

Спектакль «Дзеці. Вёрсты» па матывах творчасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа (аўтар п'есы Арцём Казюханаў) пры ўсёй прастаце, немудрагелістасці сюжэтнай асновы мае другі, падтэкставы, філасофскі, сімвалічны план. І гэта, здаецца, вельмі добра адчуў выканаўца адной з цэнтральных роляў — Станцыйнага наглядчыка — Генадзь Гайдук. Яго герой набывае нейкія абагульненыя, тыпізаваныя рысы чалавека, які шмат чаго ведае аб людзях і разумее ў жыцці такое, што цяжка нават выказаць у словах, ён — свайго роду дамаслы філосаф, назіральнік.

П'еса амерыканскіх драматургаў Уільяма Ван Занта і Джэйн Мілмор, па якой быў пастаўлены спектакль коласаўцаў «Каханне і падаткі», быццам нагадвае аб сапраўдных каштоўнасцях: каханне, павага адно да аднаго, пра якія мы часцяком забываем. І гэтая праблема набывае асаблівае гучанне праз вобраз падатковага інспектара Флойда Шпінэля, які змог убачыць і ацаніць сябе і сваё жыццё ў іншым ракурсе. Ужо казалася аб тым, што Генадзь Гайдук зусім не захапляецца ігрой, знешне яркай падачай вобраза, а шукае яго драматычную падаплёку. Драматычная нотка і тут гучыць. Можа, гэта адзінота, неўладкаванасць, нейкая чалавечая нерэалізаванасць. Выдатна артыст перадае стан, пачуцці, эмоцыі героя ў фінальнай сцэне, калі Лэслі раскрывае сапраўдную сутнасць іх намераў. Ад абуранасці нахабствам маладых людзей ён пераходзіць да рашэння дараваць. Чалавек у ім перамог, адолеў чыноўніка, службоўцу, фармальнага выканаўцу сваёй сацыяльнай ролі.

У 2002 годзе Генадзь Гайдук арганізаваў пры Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя Машэрава студэнцкі тэатр «Аўтограф», які існаваў шэсць гадоў. За гэты час былі выпушчаны вельмі цікавыя эксперыментальныя пастаноўкі: «Дактар філасофіі» Браніслава Нушыча, «Справа аб людаедстве» Уласа Дарашэвіча, «Гавялус» паводле «Выпадку ў Пасажы» («Кракадзіл») Фёдара Дастаеўскага, «Сны камарніка» паводле «Замка» Франца Кафкі, «Ніжнія Байдуны» паводле Янкі Брыля. Яны мелі вялікі розгалас сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Але, на жаль, кіраўніцтва не аказала цікаваму творчаму калектыву належнай падтрымкі, ды і не заўсёды хапала часу, Генадзь Іосіфавіч літаральна разрываўся паміж рэпетыцыямі і спектаклямі на дзвюх творчых пляцоўках. На жаль, давялося сысці. Былыя вучні Генадзя Іосіфавіча і па сёння з задавальненнем і вялікай падзякай успамінаюць тыя часы. У вольны час артыст любіць пісаць вершы, іншым разам перакладае цікавыя яму творы на беларускую мову. Як прыклад — дзіцячая п'еса «Казявачка», якая і цяпер у рэпертуары.

Генадзь Гайдук адзначаны многімі ўзнагародамі, самая высокая сярод іх — медаль Францыска Скарыны.

Хочацца пажадаць гэтаму патрабавальнаму да сябе артысту, сапраўднаму майстру творчага даўгалецця, новых яскравых роляў і ганаровага звання, якога ён даўно ўжо заслугоўвае.

Юрый ІВАНОЎСКІ
Фота даслана аўтарам

Гарачае лета ў Гургуртэпе

Урывак з аповесці[1]

Рысалат ХАЙДАРАВА
(Узбекістан)

На нябёсах хапае анёлаў…

«Усіх запрашаю на худаі ў доме дзядзькі Максуда!»

На самай справе дзядзька Максуд двойчы на год праводзіў худаі, запрашаючы паважаных старэйшын махаллі. На гэтым мерапрыемстве гасцей абслугоўвалі яго сыны і іх сябры. Таму вестка магла быць адной з самых звычайных. Але…

Але гэта быў трэці худаі, які праводзіўся ў доме дзядзькі Максуда ў гэтым годзе, што здзівіла жыхароў Гургуртэпы.

Хутка да гэтай весткі падмяшаліся і плёткі: «Дзядзька Максуд жэніцца?»

Жанчыны Гургуртэпы, вядома ж, не маглі не адрэагаваць на такую навіну.

— Ой, ён жа стары, навошта яму жаніцца?

— Хто ж пойдзе за яго?

— У яго добрыя нявесткі, што моўчкі пагадзіліся на яго жаніцьбу…

— Ой, вы гаворыце пра жаніцьбу, а дзядзька Максуд як выбіраў сабе нявесту!

— А… О… Ён яшчэ выбіраў?

— Так, яго нявесткі вельмі стаміліся, шукаючы яму старую…

У той час, калі ўся махалля была занята «прыгатаваннем» такіх навін, на кухні, размешчанай на дварэ дзядзькі Максуда, распачалася спрэчка.

— Ну, што б там ні здарылася, хоць мы крыху адпачнём, а то ўсе вельмі стаміліся, — сказала яго старэйшая дачка.

— Апа, вы толькі калі-нікалі прыходзіце да нас у госці, гэта нам давядзецца жыць разам з ёю. Таму яна павінна спадабацца нам, ці не так? — запярэчыла старэйшая нявестка. — Гэтая жанчына падалася нам найболей падыходзячай…

— Ападжон, з ёй не вы, а мы будзем жыць, бо ваш дом знаходзіцца на іншай вуліцы! — балбатала малодшая нявестка. — Гэтая жанчына падалася падыходзячай, заўважце сабе, па-да-ла-ся! Але я не зусім упэўнена, бо кажуць жа: чалавека не спасцігнеш, пакуль з ім разам не пражывеш…

— Ах, дзе вы знойдзеце самую лепшую жонку? Ці не дастаткова вам, што бацька пагадзіўся! — хацела спыніць спрэчку малодшая дачка. — І так мы два гады пакутавалі ў пошуках жонкі для бацькі! Нават маладым хлопцам гэтулькі не шукаюць нявесту!

— Сапраўды! — сказала старэйшая дачка. — Адна жанчына не можа спадабацца адначасова ўсім. Насамрэч, гэта ж праўда, што кожнай з нас спадабаліся нейкія яе станоўчыя якасці? Так што заканчвайце лішнія размовы!

— Цікава, жэніцца наш свёкар, а жонку выбіраем мы! — хіхікала малодшая нявестка.

А дзядзька Максуд, які стаў прычынай «галаўнога болю», ляжаў на расцеленай каля сцяны курпачэ і глядзеў на фотаздымак, які вісеў на сцяне. Чамусьці з раніцы яго сэрца моцна шчымела. Ён паклікаў нявестку суседа, якая працуе ў бальніцы, і папрасіў памераць яму артэрыяльны ціск. Не, ціск быў у норме. Што ж тады здарылася? Ён, на ўсялякі выпадак, выпіў парашок, які прымаў штодзённа. Вось ужо два гады ён не можа жыць без лекаў. Калі нават крышачку стане халадней, ногі адразу адчуваюць.

Хаця ён не лічыць сябе старым, ён жа яшчэ не дажыў да ўзросту свайго бацькі! Бацьку было семдзесят тры гады, калі Максуд пасля гадавіны смерці маці загадаў сястры і жонцы знайсці добрую ўдаву і ажаніў свайго бацьку. А яму самому толькі праз два гады споўніцца семдзесят. Ён ніколі і не думаў, што можа страціць жонку, не дажыўшы да сямідзесяці!

— Глядзі, Мамура, нехта збіраецца заняць тваё месца, — неспадзявана гучным голасам вымавіў ён. — Не крыўдуй на мяне, бо я вельмі стаміўся. Бачыш, ляжу на тонкім курпачэ, ногі мерзнуць, але няма нікога, хто накрыў бы мяне чапанам. Двор поўны людзей, усе непакояцца за мяне, але пры гэтым ніхто не думае пра мяне…

Яго жонка гаварыла: «На нябёсах поўна анёлаў, але яны ўсе нечым занятыя». Правільна казала! Быў бы побач унук Бахціёр, было б нашмат лягчэй. Калі ён прачынаўся ноччу, Бахціёр адразу падымаў галаву з падушкі і пытаўся: «Дзядуля, жадаеце выйсці на двор?» Ён, ускочыўшы з месца, здымаў з вешалкі яго чапан і падаваў. Пасля, каб дзядуля не спатыкнуўся ў цемры, асцярожна браў яго пад рукі. Чакаючы выхаду дзядулі, ён сядзеў на кукішках каля туалета з кумганам у руках. Дзядзька Максуд, вымыўшы рукі, браў ручнік з яго плеч і маліўся: «Няхай Алах блаславіць цябе, дзіця маё, жыві доўга, будзь багатым».

Але цяпер Бахціёра няма побач з ім. У надзеі стаць чэмпіёнам ён паступіў на вучобу, жыве ў інтэрнаце, таму толькі раз на тыдзень прыходзіць дадому. Калі ён дома, старому здаецца, што ўвесь дом зяе. Унук здымае сінюю сумку са сваіх плеч і кідае на падлогу, пасля абдымае дзядулю: «Дзед, з вамі ўсё ў парадку?» Пытаючыся, ён шырока ўсміхаецца, тады яго кароткія юначыя вусікі смешна натапырываюцца. Затым Бахціёр садзіцца побач з ім і пачынае расказваць пра тое, што бачыў і чуў на працягу апошняга тыдня. Стары ўважліва слухае яго аповед. А на наступны дзень унук расказвае навіны, якія прачытаў у інтэрнэце. Слухаючы пра тое, што здарыўся пераварот у нейкай краіне Афрыкі, на вугальным радовішчы Кітая абрушылася шахта, згарэў лес у Расіі, у Італіі вулкан выкінуў на паверхню магму, што забрала ў людзей родны дом, неверагодная паводка стала прычынай разрухі ў Амерыцы, ён ізноў усведамляў, наколькі вялікі свет. Тады яго боль падаваўся яму такім мізэрным, што ён дзякаваў Богу, што не жыве ў згаданых мясцінах. Пасля ўнук стрыг яго бараду і паліў лазню, пабудаваную ў канцы двара, каб дзядуля выкупаўся. Пасля… пасля ён раскрываў далоні, прымаў доўгае блаславенне дзеда, перакідваў сумку цераз плячо і сыходзіў. А стары пачынаў чакаць наступнай суботы.

Пачуўшы, што сёння вечарам Бахціёр прыедзе, стары адчуў палёгку. Разам з унукам да яго прыедзе ўвесь свет.

Ён прыўзняўся, падняў фіранку на акне і паглядзеў на двор. Пасля спытаў у малодшай нявесткі, якая несла паднос у бок веранды:

— Бахціёр яшчэ не прыехаў?

— Не, тата, не прыехаў. Яшчэ рана, гадзіны праз дзве-тры ён будзе дома.

Стары апусціў фіранку і зноў расцягнуўся на курпачэ. З боку двара данёсся голас старэйшага сына:

— Гэ, ці ёсць хто-небудзь дома? Хто прыме гэтыя пакункі і мяхі? Але калі яны вам не патрэбны, то магу вярнуць назад!

— Ой, мула ака, вы не ўмееце жартаваць, у вас заўжды адна і тая ж пласцінка! — гучна рассмяялася малодшая нявестка. — Давайце сюды мяшкі і пакункі, я сама іх прыму! Прыехаў ваш кухар, ён ужо нарэзаў моркву і цыбулю, цяпер чакае рыс.

«Ах, рыс… — падумаў дзядзька Максуд. — Сёння ж прыйдуць госці…»

Яго сэрца зноў закалацілася. Ён паглядзеў на фотаздымак. Яму падалося, што яго жонка злёгку нахмурыла бровы, а хустка ссунулася на бок.

Яго жонка ніколі не хмурылася на яго. Нават калі цяжка захварэла, ніколі не стагнала, ніколі не гаварыла, што ёй баліць. Хаця доктар і папярэдзіў пра тое, што наперадзе яе чакае моцны боль, але дапамагчы хворай яны ўжо былі не ў сілах. Якімі трывушчымі бываюць жанчыны! А ён жа мужчына, але стогне, не церпячы болю ў нагах.

Яго жонка была вельмі добрая. Аднойчы ноччу ён заснуў, не накрыўшыся. Прачнуўся ад холаду пасярод ночы і, намацваючы рукамі, пачаў шукаць сваю курпу. У гэты момант нехта асцярожна накрыў яго плечы. Ён, ледзьве расплюшчыўшы вочы, паглядзеў. Гэта была яго жонка!

— Мамура? — здзівіўся ён. — Як ты змагла прыйсці? Чаму ўстала?

Жонка моўчкі правяла рукой па яго лбе. Затым папаўзла ў бок свайго ложка. А ён, адкрыўшы рот, проста пазіраў ёй услед. Нават не здагадаўся сказаць: «Пачакай, я сам данясу цябе да ложка!» Цяпер, калі ўспамінае пра тое здарэнне, яму становіцца вельмі соромна.

Стары гадзіннік, які стаяў на падаконніку, пачаў звінець, але хутка сціх. О, ужо амаль палова дня!

Ён, абапіраючыся на рукі, прыўзняўся, узяў з падаконніка цюбецейку і насунуў яе на галаву. Асцярожна адчыніўшы дзверы, ступіў на лесвіцу. Выйшаў на двор і агледзеўся. Усе мітусяцца: адзін бегае з падносам у руках, другі цягае посуд, унукі ганяюцца адзін за адным, пад абрыкосам, які расце каля кухні, паставілі казан з пячуркай, і там забралася група маладых мужчын, якія гучна смяяліся.

Дзядзька Максуд узяў у рукі кумган, які стаяў на верхняй прыступцы лесвіцы. Пасля спыніў аднаго з унукаў, што мітусіліся туды-сюды:

— Ідзі, налі ў кумган цёплай вады!

Унук пачухаў патыліцу.

— Дзядуля, у лазні ёсць гарачая вада. Проста павярні кран, і ўсё! Навошта губляць час з кумганам? — выдаў параду другі, крыху старэйшы ўнук.

— Калі загадваюць старэйшыя, трэба слухацца, а не розум свой паказваць! — раззлаваўся стары.

У гэты час прыбегла амаль дарослая ўнучка.

— Дзядуля, дайце мне кумган, я сама прынясу вам вады, — сказала яна, пасля дадала. — І ручнік прынясу.

— Блаславі цябе Алах, дачушка, будзеш нявесткай у добрай сям'і…

Дзяўчына пачырванела і, падхапіўшы кумган, пабегла ў бок кухні.

З групы мужчын, якія сабраліся каля казана, аддзяліўся старэйшы сын і накіраваўся да бацькі.

— Тата, старэйшыны махаллі сказалі, што пасля намаза наведаюцца да дзядулі Сіджо, а пасля прыйдуць да нас, — сказаў ён. — А імама прывязе Асад.

Стары без усялякіх эмоцый сказаў: «Ім-м…» Здзіўлены сын замоўк, пра сябе зазначыў: «Я штосьці не так сказаў?» Але, убачыўшы, што бацька маўчыць, ён пачаў тлумачыць:

— І сваты таксама пазней прыйдуць.

Стары раўнадушна махнуў рукою: «А мне што?..» Сын запнуўся. А бацька ўзяў кумган з рук унучкі і, накіроўваючыся да лазні, сказаў:

— Ужо пад паўдня.

Старэйшы сын зразумеў яго словы па-свойму і жэстам паклікаў жонку да сябе.

— Ці ёсць у цябе што-небудзь паесці? Чаму тату не далі абед? Здаецца, ён прагаладаўся. Глядзі, ужо поўдзень!

— Ой, суп ужо зварыўся. Наліць яму, ці што? Я думала, што ён паесць пасля паўдзённай малітвы…

Старэйшы сын нахмурыўся, а яго жонка заспяшалася ў бок кухні.

Калі дзядзька Максуд пасля паўдзённай малітвы выйшаў на веранду, на нізкім століку ўжо быў засцелены белы абрус, а на ім стаяў гарачы суп у прыгожай талерцы, ляжала пара праснакоў. На курпачы, пасцеленай побач са століком, сядзеў старэйшы сын.

— Тата, вы зусім прагаладаліся, відаць, а мы былі занятыя прыгатаваннямі, вось і забыліся даглядаць вас… — сын пачырванеў і паказаў на абрус. — Паешце гарачага супу, а то стоміцеся да прыходу гасцей…

Стары зірнуў на суп у касушцы, адкуль ішла гарачая пара, на цёплыя праснакі, чайнік з піялушкамі. Пасля паглядзеў на свайго сына:

— Буду есці суп разам з гасцямі…

— Чаму?.. Але ж…

— Нешта сэрца шчыміць… Я пайду крыху паляжу…

— Тата, паклікаць доктара?

— Не… паляжу крыху, і пройдзе… Бахціёр яшчэ не прыйшоў?

Чамусьці яму зноў захацелася ўбачыць унука.

— Бахціёр прыйдзе пазней… Недзе каля пяці-шасці гадзін.

Ён нават не чуў слоў сына. Чамусьці на сэрцы было неспакойна. Як быццам павінна было здарыцца нешта непрыемнае…

Аднак сёння ён пачастуе сваіх блізкіх суседзяў і родзічаў, прыйдзе мула Абдулкарым з Бадамзарскай мячэці, з Кібрая наведаюцца каля дзесяці новых родзічаў, і яны прывядуць у яго дом яшчэ аднаго члена сям'і — Суюмахан.

Яму паказалі Суюмахан, але ён нават не задумаўся над тым, спадабалася гэтая жанчына яму ці не. «Не ведаю, колькі яшчэ жыць мне засталося, — падумаў ён. — Сорак гадоў пражыў з Мамурай. Ці пражыву з гэтай жанчынай гэтулькі ж? Так што няма чаго мне капрызнічаць».

Праўда, яго бацька пражыў дваццаць гадоў з другой жонкай і памёр, калі яму было за дзевяноста. Яго мачыха была добрай жанчынай. Яна, абдымаючы ўнукаў, а пазней і праўнукаў, сядзела, мірна размаўляючы са сваім старым. На бацьку быў белы яктак, на галаве — тонкая белая цюбецейка, і барада ў яго была белая, і ад яго веяла шчасцем чалавека, задаволенага любоўю блізкіх людзей. Вечарам, калі спяшаўся ўбачыцца з бацькам, яму падавалася, што і сам можа «наталіцца» яго шчасцем і адчуць задавальненне ад гэтага. Часам гаварыў Мамуры: «Дай Алах, каб і мы ў старасці вось так сядзелі».

Нельга не захапляцца справамі Алаха, але чаму так здарылася, што ён паўтарыў лёс бацькі? Можа быць, анёл няправільна пачуў яго мару ці ён сам няправільна выклаў яе?

Ён увайшоў у свой пакой і лёг на курпачу. Эх, трэба было сказаць нявестцы ці дачцэ, каб паслалі яму курпачу таўсцейшую. Забыўся… Ён вызірнуў з акна. У дварэ мітусіліся яшчэ болей, па адным пачалі збірацца родзічы.

«Хм… На нябёсах поўна ангелаў, але ўсе яны нечым занятыя, — падумаў ён. — Крыху паляжу, пасля выйду да іх. Усё адно ж трэба выйсці, бо прыйдуць старэйшыны махаллі».

Ён паклаў галаву на падушку. Сэрца яшчэ мацней зашчымела. Узяў коўдру, якая ляжала ўбаку, і накрыўся ёю. Цяпер яго цела пачало нямець. Нага змерзла. «Што такое? — падумаў ён. — Я замярзаю ў летнюю чыллю?»

Зірнуў на партрэт, які вісеў на сцяне, і раптам успомніў пра сварку, што адбылася два дні назад. Вечарам ён вярнуўся з вячорак старых — «гап» — і ўбачыў чырвоныя ровы нявесткі. І вось што высветлілася… Жанчыны, якія прывозілі пасаг Суюмахан і ўпрыгожвалі дом, паспрабавалі зняць гэты фотаздымак са сцяны, але старэйшая дачка не дазволіла ім. А на нявестку, якая старалася памірыць іх, насварыліся і тыя, і другія. «Бацька, хіба гэта правільна? — спыталася яна, ледзьве не плачучы. — Я проста сказала, каб яны не сварыліся з-за дробязі, а яны…»

Ён усміхнуўся пра сябе. І нораў дачкі, і ўпартасць тых жанчын падаліся яму такімі дробнымі, пустымі…

Раптам нагу звяла сутарга. Пасля… нечыя мяккія рукі асцярожна пачалі паціраць яго ногі. Ён адчуў, што яго накрылі курпой. Яму стала так лёгка… Ледзьве расплюшчыўшы павейкі, адкрыў вочы і… Убачыў знаёмыя да болю вочы, якія глядзелі на яго з любоўю. «Мамура? — спытаў ён. — Як ты сюды трапіла?» Яго жонка ўсміхнулася. «Чаму ты прыйшла?» — ізноў запытаўся ён. А жонка маўчала. Яна проста гладзіла яго лоб сваёй цёплай далонню…

* * *

Вярнуўшыся з худаі, мой тата падняўся на драўляны тапчан пад вінаграднымі лозамі і сядзеў з сумным выглядам. Чай у піялушцы астыў. Мая маці вельмі добра ведала: калі ў бацькі настрой дрэнны, яго нельга непакоіць. Таму яна моўчкі накіравалася ў другі канец двара, пачала варыць вішнёвае варэнне ў вялікім эмаліраваным тазіку.

— Часам наканаванае Алахам бывае дзіўным, — сказаў бацька. — Нельга не дзівіцца ім…

З узбекскай.
Пераклад Алеся КАРЛЮКЕВІЧА

[1] Заканчэнне. Пачатак у № 36, 2024.

У адзінай сям’і

Нацыянальная бібліятэка, Нацыянальны архіў і Беларускі саюз мастакоў арганізавалі выставачны праект «Назаўжды разам» і прымеркавалі яго да 85-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі і БССР і Дня народнага адзінства. Экспазіцыя, з якой можна пазнаёміцца ў выставачным комплексе галоўнай бібліятэкі краіны, з розных бакоў раскрывае тэму дзяржаўнага свята.

На выстаўцы «Назаўжды разам» прадстаўлены экспанаты, якія адлюстроўваюць хаду гісторыі. Убачыць іх можна ў тэматычных раздзелах «Вызваленчы паход Чырвонай арміі», «Народны сход Заходняй Беларусі» і «Усталяванне мірнага жыцця на Заходняй Беларусі». У першую чаргу звяртаюць на сябе ўвагу копіі архіўных дакументаў — дэкларацыі, тэлеграмы, лістоўкі, пратаколы пасяджэнняў бюро ЦК КП(б)Б, праекты пастаноў… Дапаўняюць іх фотаздымкі і перыядычныя выданні — паўсюль адлюстраваны падзеі восені 1939 года. Яшчэ адзін складнік экспазіцыі — кнігі, у тым ліку тыя, што перадаюць атмасферу паўсядзённага жыцця беларусаў, апавядаюць пра 17 верасня ў гісторыі краіны, расказваюць пра стаўленне творчай інтэлігенцыі да ўз’яднання — многія пісьменнікі адгукнуліся на падзею, напісалі шматлікія публіцыстычныя і паэтычныя творы. Так, можна ўбачыць кнігі «Паэзія змагання» Уладзіміра Калесніка, «З палёў Заходняй Беларусі» Уладзіміра Жылкі, «“Крэсы” змагаюцца» Міхася Машары… Натуральна, арганізатары выключылі творчасць Максіма Танка — паэт прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Увогуле ж, кніжная экспазіцыя падзелена на раздзелы «17 верасня ў гістарычнай памяці беларускага народа», «Жыццё ў Заходняй Беларусі», «Галасы Заходняй Беларусі». Цэнтральная ж частка праекта мае назву «У адзінай беларускай сям’і» — тут арганізатары прапаноўваюць выданні, прысвечаныя маладому святу — Дню народнага адзінства.

Васіль Дубовік «Зямлю — сялянам», 1989 г.

Не саступаюць у значнасці і выклікаюць асаблівую цікавасць прадстаўленыя графічныя, акварэльныя, жывапісныя і скульптурныя творы больш як 20 тагачасных аўтараў, якія апявалі мір і адлюстроўвалі жыццё беларусаў у адной краіне. Дарэчы, сёння некаторыя работы даволі рэдка дэманструюцца, нягледзячы на славутасць стваральнікаў, а менавіта Сяргея Селіханава, Акіма Шаўчэнкі, Аляксея Глебава, Сяргея Каткова, Андрэя Бембеля, Аляксандра Паслядовіча…

Зачароўваюць найперш самыя раннія творы на выстаўцы. Сярод такіх — лінагравюра Саламона Юдовіна «Першыя пераходы на Няве» 1944 года (з цыкла «Ленінград у дні Вялікай Айчыннай вайны»). Вядома, што ўраджэнец Віцебшчыны з 1924 стала жыў і працаваў у Ленінградзе. Зіму 1941—1942 правёў у гэтым горадзе, у 1942—1944 знаходзіўся ў эвакуацыі пад Яраслаўлем. Менавіта каштоўныя малюнкі, выкананыя падчас першай блакаднай зімы, сталі асновай згаданага цыкла, над якім мастак працаваў некалькі гадоў. Дарэчы, Саламон Юдовін вярнуўся ў Ленінград адразу пасля зняцця блакады, там і пражыў да смерці.

Яшчэ адзін даўні графічны твор — «У полі» (1955) Сямёна Геруса, выкананы з дапамогай сухой іголкі. Вытанчаная работа мастака, які знаходзіў натхненне пераважна ў гісторыі, яе падзеях і постацях, — зварот да вясковага пейзажа, дэталёвае апісанне прыроды, якая вабіць хараством у любую пару года, у любое надвор’е.

У ліку найбольш ранніх палотнаў — «Уборка сена» (1948) Сцяпана Андруховіча, які працаваў у станковым жывапісе. Сярод тэм, што цікавілі мастака, — рэвалюцыйны рух і жыццё пасляваеннай вёскі. «Уборка сена» якраз ёй прысвечана. Гэта невялікі лірычны пейзаж, які захапляе лаканізмам формы, выразнасцю кампазіцыі. А вось у творы Паўла Гаўрыленкі «З зямлянкі — у новы дом» (1952) ключавым становіцца ідэйны складнік. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, член Рэвалюцыйнай арганізацыі мастакоў у БССР, а пазней і старшыня Беларускага саюза мастакоў (з 1956 да 1961 года), жывапісец не мог абысці ўвагай пасляваенныя будні, подзвігі працаўнікоў. Шматпланавая кампазіцыя выбрана наўмысна, каб, па-першае, падрабязна расказаць пра тагачаснае жыццё, па-другое, выявіць усю эпічнасць адраджэння краіны пасля шматлікіх разбурэнняў вайны. Гэтай жа тэме прысвячалі творы Анатоль Тычына, Леў Лейтман, Яўген Красоўскі, Анатоль Шыбнёў, Яўген Санько ды іншыя аўтары, чый плён працы можна ўбачыць сёння на выстаўцы «Назаўжды разам». Пазнаёміцца з ёй можна да 31 студзеня 2025 года.



Сяргей Каткоў «Лагойскі мытыў», 1968 г.

Фрагмент экспазіцыі.

Анатоль Шыбнёў «Навальніца прайшла», 1980 г.

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота аўтара

зваротная сувязь

Сагрэем душу добрым словам

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». У чацвер — публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова».

Радыёверсію тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча можна паслухаць у нядзелю і панядзелак.

Па буднях — праграма «Літаратурная анталогія». «Радыёбібліятэка» з панядзелка да пятніцы. У праграме «Прачулым радком» у выхадныя — вершы беларускіх паэтаў.

«Літаратурныя гісторыі» пазнаёмяць з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

Перадача «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу і нядзелю.

Для юных прыхільнікаў мастацкага слова — праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

Праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам новага нумара «ЛіМа».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

30 верасня — у дзіцячую бібліятэку № 16 (вул. Якубоўскага, 32) на літаратурную імпрэзу, прымеркаваную да Сусветнага дня перакладчыка. Пачатак у 14.00.

1 кастрычніка — у публічную бібліятэку № 8 імя М. Багдановіча (вул. Даўгабродская, 12/2) на творчую сустрэчу з Ірынай Захаравай. Пачатак у 13.00.

2 кастрычніка — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Верасок» (вул. Адзінцова, 24). Госць — часопіс «Буся». Пачатак у 10.00.

3 кастрычніка — пачынаючых літаратараў у Школу юных паэтаў і празаікаў (вул. Фрунзэ, 5, п. 309). Пачатак у 15.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
26.09.2024 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 693

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 3820000000667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2074

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 24037